ПРАЛЕТАРЫ! УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 50 (2216)
25 чэрвеня 1968 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ЛЕНІНУ, ПАРТЫІ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

У красавіку 1970 года ў сталіцы нашай Радзімы Маскве адбудзецца Усесаюзная мастацкая выстаўка, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна.

Пра гэта паведамлена 21 чэрвеня на пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры СССР і сакратарыята праўлення Саюза мастакоў СССР.

Шырокі тэматычны дыяпазон выстаўкі прадугледжвае поўны, разнастайны паказ вобраза Уладзіміра Ільіча Леніна, трыўмфу яго ідэй. Пра гэта гаварылі ў выступленнях на пасяджэнні сакратар праўлення Саюза мастакоў СССР К. Белашова, скульптар М. Томскі, віцэ-прэзідэнт Акадэміі мастацтваў СССР В. Кеменаў, міністр культуры СССР К. Фурцава і іншыя.

□

Камітэт па друку пры Савеце Міністраў СССР, Міністэрства культуры СССР і Саюз мастакоў СССР прынялі рашэнне аб правядзенні конкурсу на лепшыя палітычныя плакаты, прысвечаныя 100-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна.

Мэта конкурсу — садзейнічаць з'яўленню яркіх твораў плакатнага мастацтва, якія раскрыюць значэнне ленінскіх ідэй у гісторыі сусветнага рэвалюцыйнага руху і ў будаўніцтве камуністычнага грамадства, яднанне партыі і народа, умацаванне братэрства і дружбы народаў СССР.

Конкурс праводзіцца ў тры туры. Пераможцы ўзнагароджваюцца дыпломамі лаўрэата.

Тэрмін прадстаўлення работ на конкурс — па 1 снежня 1968 года.

ПАТРЭБНА, ЯК ЦЭМЕНТ...

ПАСТАЯННАЯ КАМІСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР ПА КУЛЬТАСВЕТРАБОЦЕ АБМЯРКОЎВАЕ СТАН КУЛЬТУРНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ РАБОЧЫХ ВАЖНЕЙШЫХ НОВАБУДОЎЛЯЎ І НАСЕЛЬНІЦТВА НОВЫХ ПРАМЫСЛОВЫХ ЦЭНТРАЎ.

Калі б мы зрабілі карту-макет Беларусі, запаліўшы каляровыя лямпачкі на месцы заводаў, фабрык, хімічных камбінатаў, электрастанцый, якія зараз будуюцца, то ўся рэспубліка заззяла б сузор'ем незвычайнай прыгажосці. І ў гэтым сузор'і можна было б налічыць не адзін дзесятак зорак «першай велічыні»—найбольш важных будоўляў сярэдзіны пяцігодкі. Яны —сённяшняе аблічча рэспублікі, яны — наша гордасць.

Можна з упэўненасцю сказаць, што ўдзел у іх збудаванні прымае ўвесь народ. Многія аб'екты беларускі камсамол аб'явіў ударнымі камсамольскімі будоўлямі. Будаўнікам прысвячаюць сваю творчасць многія нашы пісьменнікі, мастакі, кампазітары, артысты. Справай свайго гонару лічаць выхаваўчую і асветную работу на вялікіх будоўлях нашы культармейцы.

У свой час сесія Вярхоўнага Савета рэспублікі разгледзела стан і меры паляпшэння работы культасветустаноў рэспублікі, у тым ліку на новабудоўлях і ў новых прамысловых цэнтрах. У парадку выканання пастановы сесіі Міністэрства культуры БССР, Беларускі рэспубліканскі савет прафсаюзаў і Цэнтральны Камітэт камсамола Беларусі распрацавалі і зацвердзілі вялікі план культурнага абслугоўвання працоўных ударных камсамольскіх будоўляў у юбілейным годзе.

Днямі адбылося пасяджэнне камісіі Вярхоўнага Савета БССР па культасветрабоце, на якім ішла размова аб ходзе выканання пастановы сесіі. З інфармацыяй на пасяджэнні выступілі намеснік міністра культуры БССР Р. Мачулін і сакратар Белсаўпрофа М. Дубкова.

Камісія адзначыла прыкметныя зрухі ў культурным абслугоўванні калектываў новабудоўляў. Шмат зроблена культасветустановамі Наваполацка, Жодзіна, Светлагорска, Салігорска, Магілёўскага камбіната сінтэтычнага валакна, Гомельскага суперфасфатнага і Гродзенскага азотнатукавага заводаў, Лукомльской ДРЭС. Іх работа стала цясней увязвацца з вытворчымі планамі прадпрыемстваў, з задачамі, якія стаяць перад будаўнікамі.

Многія прафесіянальныя і аматарскія мастацкія калектывы Мінска выязджаюць з шэфскімі канцэртамі на будоўлі пяцігодкі, аказваюць дапамогу мясцовым калектывам мастацкай самадзейнасці.

Цыкл музычных лекцый-канцэртаў правяла ў Магілёве на «Лаўсанбудзе» Беларуская дзяржаўная філармонія. Са спектаклямі да салігорцаў выязджалі мінскія драматычныя тэатры. На ўсіх вялікіх будоўлях выступалі калектывы і асобныя выканаўцы — удзельнікі фестывалю беларускага прафесіянальнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Будаўнікоў Лукомльской ДРЭС наведала група творчай інтэлігенцыі Мінска. Шэсць перасоўных фотавыставак «БССР за 50 гадоў» арганізаваў і днямі разашле па рэспубліцы Дзяржаўны мастацкі музей. Метадычным кабінетам культасветработы і Рэспубліканскім Домам народнай творчасці складзены і разасланы рэпертуарныя зборнікі для спевакоў, танцораў, чытальнікаў, удзельнікаў агітбрыгад.

Сотні рабочых, майстроў, інжынераў працуюць сёння на Гродзенскім азотнатукавым заводзе. Каля 2,5 тысяч будаўнікоў занята на будаўніцтве цэха капралактаму. Гэта вялікая і ўдзячная аўдыторыя слухачоў і гледачоў. Гродзенскі абласны драматычны тэатр паказаў ужо для яе шэсць спектакляў. 16 разоў выступаў перад імі ансамбль «Нёман». Прыязджалі ў госці да будаўнікоў гіганта хіміі лепшыя самадзейныя калектывы з Дзятлаўскага, Свіслацкага, Берастовіцкага, Зельвенскага і іншых раёнаў.

Абласная і Гродзенская гарадская бібліятэкі зрабілі шмат тэматычных агляды літаратуры, арганізавалі некалькі цікавых вечароў. Прымаюць удзел гэтыя бібліятэкі і ў арганізацыі сустрэч будаўнікоў з ветэранамі рэвалюцыі, грамадзянскай і Айчыннай войнаў, ветэранамі працы і перадавікамі вытворчасці, у правядзенні канферэнцый чытачоў. Работнікі Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея працталі на азотнатукавым больш як 50 лекцый з цыклаў, прысвечаных юбілею рэспублікі.

Вельмі папулярнае ў азотнатукаўцаў маладзёжнае кафэ. Камсамольцы і моладзь праводзяць тут «агеньчыкі», вечары баявой і працоўнай славы, «пасвячэнні ў рабочыя», сустрэчы з пагранічнікамі заставы імя В. Усава, над якой яны шэфствуюць.

Ажывіў работу ў юбілейным годзе клуб будаўнікоў трэста № 11, якія будавалі азотнатукавы і зараз будуюць цэх капралактаму. Пры клубе працуюць шматлікія гурткі мастацкай самадзейнасці, агітбрыгада «Драбілка», якая сёлета восем разоў выступала непасрэдна на будаўнічай пляцоўцы і больш 50-ці—у рабочых інтэрнатах. Шмат будаўнікоў капралактамавага наведваюць архітэктурна-будаўнічы універсітэт, які працуе пры клубе. Не забываюць работнікі клуба і членаў сем'яў рабочых. Для дзяцей арганізаваны музычная і балетная студыі, школьны кінатэатр «Равеснік».

Шмат павучальнага ў рабоце культасветустаноў Наваполацка, асабліва ў клубе будаўнікоў і ў Палацы культуры нафтавікоў. Вялікая ўвага тут звернута на забеспячэнне культурнага адпачынку ў выхадныя дні і на выхаваўчую работу ў інтэрнатах. У кожным інтэрнаце створаны саветы, якія распрацавалі перспектыўныя планы работы і сочаць за іх выкананнем. Тут чытаюць цыклы лекцый, прысвечаных юбілею рэспублікі, 50-годдзю ВЛКСМ, 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Складзены маляўнічыя фотаальбомы аб першых брыгадах камуністычнай працы. У інтэрнаце № 143 выпускаецца вусны часопіс «Людзі і традыцыі роднай будоўлі». Вельмі папулярныя тут сатырычныя і радыёгазеты.

Разам з тым было адзначана, што ў рабоце культасветустаноў Наваполацка няма ўзаемных кантактаў, хоць яны маюць справу з адным і тым жа кантынгентам слухачоў і гледачоў. Клуб будаўнікоў і Палац культуры нафтавікоў зусім не звязаны паміж сабой. Кепска і тое, што мала ў калектывах мастацкай самадзейнасці рабочых асноўных прафесій. Напрыклад, сярод 470 ўдзельнікаў гурткоў Палаца культуры нафтавікоў толькі каля 30 працэнтаў рабочых адзначанай катэгорыі. У складзе чытачоў бібліятэк працэнт рабочых асноўных прафесій не складае і палавіны. На пасяджэнні камісіі падкрэслівалася таксама, што работнікі культасветустаноў павінны пашыраць сферу свайго дзеяння, не абмяжоўвацца толькі рабочымі сваіх прадпрыемстваў.

У будаўнікоў Гомельскага суперфасфатнага завода дасюль не створаны калектывы мастацкай самадзейнасці. Слаба працуюць гурткі на Светлагорскім камбінаце штучнага валакна. Членам камісіі, якія праводзілі праверку, нямала скардзіліся рабочыя Салігорскіх калійных камбінатаў на работу гарадскіх кнігарань. У горадзе шмат студэнтаў-завочнікаў, але купіць патрэбныя кніжкі амаль немагчыма. Чамусьці зусім няма музычнай літаратуры і нот.

У многіх з названых новых прамысловых гарадоў часта дэманструюцца нізкапробныя зарубежныя фільмы, якія не ідуць на экранах у вялікіх гарадах. Гэтыя фільмы аказваюць шкодны ўплыў на выхаванне моладзі. На гэта, а таксама на тое, што трэба больш увагі ўдзяляць рэпертуару мастацкіх калектываў, звярталі ўвагу члены камісіі, дэпутаты Р. Шырма, М. Гарзеў і іншыя.

Паўсюдна таксама давялося членам камісіі чуць скаргі на тое, што няма дзе пашыць сцэнічную вопратку для ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці. Дэпутаты прапанавалі ўключыць ў пастанову камісіі просьбу да выканкомаў абласных Саветаў дэпутатаў працоўных стварыць у кожнай вобласці не менш аднаго камбіната ці спецыялізаванага атэльє-майстэрні, каб шыць для гурткоўцаў касцюмы, абутак, выраблялі галаўныя ўборы і іншыя прадметы, неабходныя для нармальнай работы калектываў мастацкай самадзейнасці.

Намеснік старшыні Саюза мастакоў БССР, дэпутат А. Бембель падкрэсліў, што неабходна звярнуць увагу на ўзровень наглядная агітацыі. Нярэдка яшчэ заклікі, пано, плакаты адстаюць ад задач, якія стаяць перад будаўнікамі, носяць вельмі агульны характар, пазбаўлены вастрыні і мэтанакіраванасці. А мастацкі ўзровень выканання сродкаў наглядная агітацыі часта не вытрымлівае ніякай крытыкі.

Шмат увагі ўдзяліла камісія будаўніцтву ўстаноў культуры. Гэтае пытанне даўно ўжо набалела. Калійным камбінатам у Салігорску будуецца Дом культуры так доўга, што нават праект маральна ўстарэў. Калі будзе закончана будаўніцтва—невядома. Няма ў Салігорску больш-менш прыстойнага памяшкання для гарадской бібліятэкі, Палаца піянераў, не будуецца спартыўны комплекс.

Для рабочых Гомельскага суперфасфатнага завода будуецца Дом культуры на 800 месц. Але як? Сёлета па плану патрэбна было асвоіць 250 тысяч рублёў, а будаўнічае ўпраўленне № 46 трэста № 14 асвоіла ўсяго... 40 тысяч. Тут пагарджаюць культурнымі запатрабаваннямі рабочых, выдзяляюць будаўнічыя матэрыялы на Дом культуры як на аб'ект трэцеступеннай важнасці. Пачаў будаваць Дом культуры Гродзенскі азотнатукавы завод і, натуральна, у тым месцы, дзе больш за ўсё жыве рабочых завода. Але кіраўнікі горада наклалі «вета», ім, бачыце, не спадабалася, што новая ўстанова культуры не будзе стаяць у цэнтры Гродна. Будоўлю «замарозілі»...

На пасяджэнні камісіі выступілі таксама яе старшыня дэпутат В. Смірноў, дэпутаты—старшыня калгаса «Кастрычнік» Веткаўскага раёна В. Сабалеўскі, начальнік інструментальнага цэха Магілёўскага аўтазавода імя С. Кірава М. Райкоў.

Па абмеркаваным пытанні была прынята пастанова.

П. МІСЬКО.

50 год БССР — НАСУСТРАЧ СЛАЎНАМУ ЮБІЛЕЮ

Прыдзвінне гаворыць: «ДА НОВЫХ СУСТРЭЧ!»

НА ВІЦЕБШЧЫНЕ ЗАКОНЧЫЎСЯ ФЕСТЫВАЛЬ БЕЛАРУСКАГА ПРАФЕСІЯНАЛЬНАГА МАСТАЦТВА.

Учора, на дзесяты дзень свята беларускага прафесіянальнага мастацтва на Віцебшчыне, дарогі рэспубліканскага фестывалю зноў сышліся ў абласным цэнтры. Тут адбыўся вялікі заключны канцэрт, у якім выступілі Беларускі дзяржаўны народны аркестр, камерны аркестр Беларускай філармоніі, ансамбль «Лявоніха», салісты Беларускага тэатра оперы і балета і філармоніі.

На сцэну Палаца культуры Упраўлення бытавога абслугоўвання сталічныя артысты прынеслі настрой ад незабыўных хвалюючых сустрэч з віцяблянамі. Госці паказалі ў нашым азёрным краі здабыткі беларускага мастацтва, а ўзамен атрымалі ўсю шчырасць пачуццяў працоўных Прыдзвіння.

Ад імя працоўных Віцебшчыны цёплае слова на заключным канцэрце сказала начальнік абласнога ўпраўлення культуры Галіна Клёсава. Калектывы і вялікая група ўдзельнікаў фестывалю на Віцебшчыне ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі абкома партыі і аблвыканкома.

Эстафету фестывалю прафесіянальнага мастацтва прымае Мінршчына.

У. ГАНЧАРОЎ.
(па тэлефоне).

Найпершыя модніцы шыюць сабе касцюмы і сукенні з тканін Мінскага тонкасуконнага камбіната. Ткачыхі і прадзільшчыцы прадпрыемства — добрыя танцоры і спевакі. Танцавальны калектыў камбіната (кіраўнік Р. Сушчынская) да 50-годдзя БССР рыхтуе новую канцэртную праграму — беларускія народныя танцы і танцы народаў брацкіх рэспублік, арыгінальныя кампазіцыі. Вось адзін з нумароў гэтай праграмы — іскрысты, віхурны «Украінскі танец».

Фота Х. ГРЫГОР'ЕВА.

СМАРГОНШЧЫНА — ЗЯМЛЯ ПЕСЕННАЯ

У Смаргоні закончыўся першы тур раённага агляду мастацкай самадзейнасці, прысвечаны 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі.

Кожную нядзелю ў раённым Доме культуры наладжваліся канцэрты калгасных артыстаў. І вось вынікі: выступілі 28 хораў, тры струнныя аркестры, пяць танцавальных калектываў, многа салістаў-спевакоў, чытальнікаў, — усяго звыш тысячы аматараў самадзейнага мастацтва.

— Летась у аглядзе ўдзельнічала напалавіну менш самадзейных артыстаў, — гаворыць загадчык раённага аддзела культуры Рыгор Лабоха. — Да паўвекавога юбілею рэспублікі кожны старшыня калгаса імкнецца займець самадзейны калектыў. Недахопу ж у спеваках у нас ніколі не было. Смаргоншчына — зямля песенная!

Маладыя калектывы ўбіраюцца ў сілу. Авалодаць майстэрствам харавога спявання ім дапамагае дырэктар музычнай школы М. Жаўрыд (кіруе трыма хорамі — калгасаў «Запаветы Леніна», «Сцяг перамогі» і «Вішнева»). Завуч гэтай жа школы А. Барсук вядзе два калектывы — хоры калгасаў «Першае мая» і «40 год Кастрычніка».

Хор калгаса «Чырвоны партызан» аб'ядноўвае 70 спевакоў (дырыжор — піянерважатая Залескай сярэдняй школы М. Далінская). Пры хоры створана танцавальная група, якой кіруе ўдзельнік ансамбля імя Агінскага Пётр Южык. У яе рэпертуары народныя танцы «Юрачка», «Лявоніха», «Беларуская полька». Пастаўлена вакальна-харэаграфічная карцінка «Вечарынка ў калгасе» на музыку Палонскага. Хутка ў «Чырвоным партызане» будзе першы ў раёне калгасны ансамбль песні і танца.

У заключным канцэрце агляду прыняло ўдзел каля 600 чалавек. Прыгожа і магутна прагучаў зводны хор.

Другі тур раённага агляду адбудзецца ў кастрычніку.

4000 КАЛЕКТЫВАЎ, 55000 УДЗЕЛЬНІКАЎ

Каля чатырох тысяч калектываў мастацкай самадзейнасці Мінскай вобласці ўключыліся ў творчае спаборніцтва, прысвечанае 50-гадоваму юбілею рэспублікі і Кампартыі Беларусі. Аматары харавой песні і эстраднай музыкі, тэатральнага, танцавальнага і вакальнага мастацтва, а іх у вобласці 55 тысяч, падрыхтавалі новыя праграмы сваіх выступленняў.

Закончыўся агляд народных талентаў на Мінскім аўтамабільным і трактарным заводах, на камвольным камбінаце, у політэхнічным і тэхналагічным інстытутах, у Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна, на прадпрыемствах, у навучальных і іншых установах Маладзечна.

Фінал абласнога спаборніцтва самадзейных творчых калектываў і салістаў адбудзецца ў Мінску напярэдадні святкавання юбілею рэспублікі.

БЕЛТА

НОВАБУДОЎЛІ КАЛГАСАЎ НАВАГРУДЧЫНЫ

Прыгожая вёска Валеўка — цэнтр калгаса «Свіцязь»: прысады, ля кожнага дома кветнік. На яе вуліцах паявіліся новабудоўлі, уступіў у строй камбінат бытавога абслугоўвання. Непадалёку ад яго будуецца палац культуры. Праўленне калгаса адпусціла на гэты аб'ект 110 тысяч рублёў.

Палац культуры будуецца па сучаснаму праекту, у ім будзе глядзельная зала на 400 месц, шырокаэкранная кінаўстаноўка, бібліятэка з чытальнай залай, музей гісторыі калгаса і мясцовай школы. Восенню ля палаца культуры пасадзяць маладыя дрэўцы. Пройдуць гады і вырасце на гэтым месцы парк. Непадалёку размесціцца спартыўны комплекс.

Мяркуецца, што палац культуры будзе гатовы праз якія пару месяцаў. У ім хлебаробы ўрачыста адзначаць 20-годдзе свайго калгаса.

У юбілейным годзе калгасы Навагрудскага раёна будуюць 13 клубаў і палацаў культуры. Хутка справяць наваселле ў сваім клубе хлебаробы калгаса імя Матросава. 50-годдзе з дня ўтварэння БССР і Кампартыі Беларусі адзначаць у новых клубах калгаснікі сельскагаспадарчых арцеляў імя Кірава, «Нёман», «Навіны».

Летась у раёне было пабудавана восем калгасных клубаў. Трохпавярховы будынак палаца культуры вырас у калгасе «Звязда». Прыгожы і зручны для адпачынку і вучобы хлебарсбаў палац калгаса «Рассвет», на будаўніцтва і абсталяванне якога выдаткавана 230 тысяч рублёў.

За поспехі ў будаўніцтве сельскіх культурна-бытавых устаноў Навагрудскаму раёну ўручаны пераходны Чырвоны сцяг абкома КПБ і аблвыканкома. У ліпені ў раён прыедуць удзельнікі ўсесаюзнага семінара па перабудове вёскі, каб пераняць вопыт навагрудчан.

СПРАВАЗДАЧА ЎМЕЛЬЦАЎ

Некалькі вялікіх прасторных пакояў Маладзечанскага міжраённага Дома народнай творчасці ператварыліся ў выставачныя залы. Тут 24 чэрвеня адкрылася выстаўка работ народных умельцаў, прысвечаная 50-годдзю з дня ўтварэння БССР і Кампартыі Беларусі.

Святочна выглядаюць залы юбілейнай выстаўкі, у якіх экспануецца каля 800 работ народных майстроў Маладзечаншчыны. Многа прадстаўлена ткацкіх работ: посцілкі, ручнікі, дываны, настольнікі, розныя сурвэткі... На дзіва прыгожыя гамы фарбаў, багатая фантазія ўзораў, высокая тэхніка ткацтва захапляюць наведвальнікаў. Цікавыя па колеру і па рысунку ткацкія вырабы работніцы саўгаса «Мэліноўшчына» Ніны Фёдараўны Казакевіч, калгасніцы з вёскі Укропава Аляксандры Васільеўны Аўдзеевіч. А работніца саўгаса імя Янкі Купалы выткала тэматычны дыван, які назвала «Лявоніха».

На выстаўцы шырока прадстаўлены разьба па дрэве, жывапіс, інкрустацыя з саломкі, розныя ажурныя рэчы, выпіленыя з фанеры, карункі, сплеценыя рукамі калгасніц.

НА РАДЗІМЕ БУРАВЕСНІКА

Тры дні, 21—23 чэрвеня, у Горкім, на радзіме вялікага пралетарскага пісьменніка, праходзіў аб'яднаны пленум праўленняў Саюзаў пісьменнікаў СССР і РСФСР. Для ўдзелу ў пленуме, прысвечаным 100-годдзю з дня нараджэння А. М. Горкага, у Горкі прыехалі пісьменнікі ўсіх саюзных рэспублік, а таксама прадстаўнікі літаратур дваццаці дзвюх краін Еўропы, Азіі, Амерыкі, Аўстраліі.

Пленум адкрыў сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР Г. Маркаў. Пісьменнікаў вітаў старшыня Горкаўскага аблвыканкома І. Чугуноў. З дакладам «Традыцыі А. М. Горкага і сучасная літаратура» выступіў сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР Б. Рурыкаў.

Усхваляваныя словы пра заснавальніка літаратуры сацыялістычнага рэалізму сказалі на пленуме: рэктар Літаратурнага інстытута імя А. М. Горкага У. Піменаў, першы сакратар праўлення Маскоўскага аддзялення Саюза пісьменнікаў РСФСР С. Міхалкоў, Г. Абашыдзе (Грузія), А. Кешокаў (Кабардзіна-Балкарыя), Л. Навічэнка (Украіна), М. Дудзін (Ленінград), М. Рыленкаў (Смаленск), А. Лупан (Малдавія), Д. Кугульдзінаў (Калмыкія), Мірзо Турсун-задэ (Таджыкістан), Расул Гамзатаў (Дагестан), Н. Мардзвінаў (Якуція), Р. Аванесян (Арменія), С. Хакімаў (Татарыя), П. Хузангай (Чувашыя), С. Васільеў (Масква), М. Кочын (Горкі), В. Панкоў (Масква), А. Жараў (Масква), А. Смердаў (Новасібірск), М. Румянцава (Тамбоў).

Цёпла сустрэлі ўдзельнікі пленума выступленні Марыі Тэрэсы Леон (Іспанія), Івана Цвяткова (Балгарыя), Кекунікана Найіра (Індыя).

Удзельнікі пленума ўсклалі вянкі і букеты кветак да помніка М. Горкага, зрабілі экскурсію па гораду, пабывалі ў Літаратурным музеі А. М. Горкага, у «Доміку Кашырына», дзе прайшло дзяцінства пісьменніка, азнаёміліся з іншымі горкаўскімі мясцінамі.

У рабоце пленума прымала ўдзел дэлегацыя беларускай пісьменніцкай арганізацыі: І. Мележ, Я. Брыль, П. Панчанка, І. Шамякін, М. Ткачоў В. Быкаў.

НА ЦІХМЯНОЎСКАЙ ВЫШЫНІ

Было гэта ў лютым 1944 года. Два дні ішоў няроўны бой за Безымянную вышыню, што ля вёскі Асіпенкі Лёзненскага раёна. 38 савецкіх воінаў 3-й батарэі 12-га мінамётнага палка пад камандаваннем старшага лейтэнанта Ціхмянава двое сутак абаранялі вышыню... 26 варожых атак адна за адной. 800 фашысцкіх ваяк удзельнічалі ў гэтай аперацыі. Жменька савецкіх герояў стаяла насмерць, не адступіла ні на крок. У жывых засталося 14 воінаў. Абаронцы вышыні атрымалі ўрадавыя ўзнагароды, дваім — старшаму лейтэнанту Ціхмянаву і сакратару камсамольскай арганізацыі Багамолаву — прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

Працоўныя Лёзненскага раёна свята шануюць мясціны, дзе ішоў гэты няроўны бой. Безымянную вышыню яны назвалі цяпер Ціхмяноўскай.

Ля вёскі Асіпенкі па праекту архітэктара Л. Азёравай будзе пабудаваны манументальны помнік. Віцебскія мастацкія майстэрні працуюць над барэльефамі да яго.

Помнік героям мяркуецца адкрыць да 50-годдзя БССР.

У ЛІКУ ЛЕПШЫХ РАБОТ ЮБІЛЕЙНАГА ГОДА

Летась праводзіўся Усесаюзны конкурс на лепшы драматычны твор і музычны спектакль, прысвечаны 50-годдзю Вялікага Кастрычніка. Міністэрства культуры СССР падвяло вынікі гэтага творчага спаборніцтва.

Сярод адзначаных работ — тры спектаклі беларускіх тэатраў. За балет «Альпійская балада» (музыка Я. Глебава, лібрэта Р. Чарахоўскай) калектыў Беларускага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета ўдастоены трэцяй прэміі. Журы конкурсу асобна адзначыла балетмайстра спектакля А. Дадзішкаліяні, дырыжора Г. Дугашава, мастака Я. Чамадурава. Кампазітару Я. Глебаву прысуджана другая прэмія.

Сярод драматычных твораў дыплом другой ступені атрымаў Дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы за спектакль «Людзі на балоце» па раману І. Мележа (аўтары інсцэніроўкі Т. Абакумоўская і З. Браварская).

Спектакль Брэсцкага абласнога драматычнага тэатра імя Ленінскага камсамола Беларусі «Сэрца на далоні» па раману І.-Шамякіна (інсцэніроўка Ю. Арынянскага і І. Шамякіна) адзначаны заахвочвальным дыпломам.

Васіль Макарэвіч

ПАХ ЖЫВІЦЫ

НАРЫС

ЯДОЎГА блукаў па лесе, аж пакуль ад лясного дурману, што плыў, узнімаўся з верасоў, цёк з разагрэтых на сонцы дрэў, разбалелася галава. Азірнуўся навокал і пачаў прыпамінаць — у які бок трэба ісці, каб выбіцца на дарогу. Заблудзіцца я не баяўся, бо ведаў: дарога недзе тут, пад бокам. Пастаяў, прыслухаўся і хутка пачуў гул машын і бразгат прычэпаў. З кожнай сотняй крокаў лес радзеў, між дрэў палоскамі пачынала прасвечвацца сінеча і раптам ветрык данёс да мяне пах, падобны да паху звычайнай каламазі, але больш прыемны, бо да яго прымешвалася яшчэ некалькі пахаў-прыпраў: смалы-жывіцы, шкіпінару і нешта накшталт нагрэтай сасновай кары. Я ўспомніў, што недзе тут, побач з шасейкай, стаіць смалазавод, ці, як называюць тутэйшыя жыхары, «смалярня», і пайшоў напрасткі.

Неўзабаве пышнакронныя сасёнкі разбегліся ў бакі, і я ледзь не наткнуўся на агароджу, зробленую па-гаспадарску дбайнай рукой, угледзеў непадалёк ад сябе шырокі праход, які, напэўна, служыў варотамі, не раўнуючы як дэгустатар, смакуючы смалакурны пах, узыдоў на двор, што быў прасмолены і чорны ад дробных кавалачкаў драўнянага вугалю, які хрумстаў і адчайна пішчаў пад калянымі падэшвамі. Мне, як на далоні, адразу ўбачылася ўся гаспадарка: янтарна-чырванаватыя штабялі смаляных карчоў; гара чорнага, як антрацыт, драўнянага вугалю; жоўтыя, з пацеркамі смалы на сценах, домікі, у якіх, відаць, жывуць рабочыя. А пасярод — задымлены і чумазы, падобны да качагара, што прапах вугалем, рупіўся, працаваў маленькі заводзік. Ва ўсёй яго паставе, няспешнасці ўгадвалася нейкая шматгадовая трываласць. Так і бачылася, уяўлялася: хвошчуць вятры, як з вядра, льюць ліўні, трашчаць маразы, смаліць ліпеньскае сонца,— а ён стаіць сабе маленькі ды ўдаленькі, глытае карчы, гоніць смалу, — робіць сваю справу.

Насустрач шырокімі крокамі ідзе майстар смалазавода Яўген Цімафеевіч Хораў. Гэта ўжо пажылы, крыху паўнаваты чалавек, але па ўсяму відаць — увішны і рухавы. Апрануты ён у сінія шырокія галіфэ, з высокімі халявамі боты, цемнаватага колеру пінжак.

Яўген Цімафеевіч доўга і смачна цісне і трасе мне руку, а потым, гледзячы знізу ўверх прама ў вочы, нечакана пытае:

— Што — здзіўляецеся? Дваццаты век: электронна-вылічальныя машыны, запускі касмічных караблёў, а тут — смалакурня...

Па інтанацыі голасу, па хітраватай усмешцы, з якой майстар усё гэта гаворыць, я зразумеў: ён упэўнены, што іменна так я і думаю і скажу іменна так, і тады ён спляжыць мяне тысячамі довадаў, што я памыляюся, як і ўсе астатнія, хто скептычна глядзіць сёння на смалярню. Так яно і ёсць! Убачыўшы, што я маўчу, Яўген Хораў пачынае хваліцца, якія далікатэсы пастаўляе дзяржаве смалазавод: шкіпінар — раз!, падсмольную ваду — два!, смалу — тры!

— Правіла! прасмоленыя канаты ад Архангельска і да Канады, — нечакана пачынае дэкламаваць майстар.

— Вы паэт? — здзіўляюся я.

— Не, гэта прыдумаў наш апаратчык Валодзя Пілішчук. Ён у нас такі чмут! Скажа іншы раз такое, ад смеху хоць жыватом па зямлі поўзай. А тут, у вершы гэтым, праўда ёсць. Смала наша ідзе нават на экспарт. І ў Канаду, і ў іншыя краіны. Кажуць, прасмольваюць ёй канаты, канапацяць судны, каб не працякалі. Але і гэта яшчэ не ўсё. Смалу мы варым з пнёў. А пні гэтыя падрыўнікі рвуць у дзялянках. Выходзіць, што ачышчаем зямлю. На ачышчанай дзялянцы, што хочаш рабі: узорвай яе пад жыта, ці засявай маладымі саджанцамі ды дажыдайся новага лесу.

Хораў час ад часу пазірае на мяне з выглядам пераможцы. Па ўсім бачна, што ён любіць смалазавод і гатоў расказваць пра яго гадзінамі.

ПЕРАД Хоравым майстрам на смалазаводзе працаваў Баркін. Нават і цяпер, едучы ў аўтобусе, той-сёй з пасажыраў, нібы той гід, які хоча паведаміць пра важнае гістарычнае месца ці помнік, урачыста казаў пра смалазавод: «Спадчына Баркіна».

(Заканчэнне на 3-й стар.).

УБАЧЫЎ ВЯСЁЛЫ ЧАЛАВЕК

«ДЗЯЦІНСТВА НАШЫХ БАЦЬКОЎ»

«ТАРАС НА ПАРНАСЕ»

«СЫМОН-МУЗЫКА»



«ПАЛЯУНІЧЫ»

Той, хто пабываў на нядаўняй рэспубліканскай выстаўцы прыкладнога мастацтва, прысвечанай 50-годдзю БССР і КПБ, не мог не заўважыць сярод яе экспанатаў гэтых смяшлівых гліняных фігурак.

«Дзяцінства нашых бацькоў», «Тарас на Парнасе», «Паляўнічы», «Сымон-музыка»... Колькі ў іх дасціпнасці, гумару, весялосці! І, разам з тым, кожная з гэтых гліняных статуэтак зроблена з сапраўдным майстэрствам, кожная — непаўторны народны тып, пэўны чалавечы характар. Глядзіш на іх і, не хаваючы добрай усмешкі, думаеш: падгледзеў іх у жыцці, адшукаў у сюжэтах народных казак, у творах пісьменнікаў натуральны, удумлівы і абавязкова вясёлы чалавек. А яшчэ — таленавіты, бо вось жа — убачанае і адшуканае перададзена яркa і малаўніча, гліна ажыла, загаварыла, засмялася...

Зваць гэтага вясёлага чалавека — Мікалай Мікітавіч Пушкар. Жыве ён у Мазыры і працуе слесарам на заводзе меліярацыйных машын. А мастацкая кераміка — яго другое прызванне, якому ён аддае цяпло сваёй душы і вольны час.

У 25 КРАІН СВЕТУ

НАША бібліятэказнаўства накапіла за гады Савецкай улады багаты вопыт. Ім мы шчодра дзелімся з бібліятэкамі зарубежных краін і, перш за ўсё, з краінамі сацыялістычнага лагера. У сваю чаргу ўсё лепшае, што ёсць у вопыце работы бібліятэк за мяжой, савецкія бібліятэкі запазычваюць сабе.

Многія беларускія бібліятэкары пабывалі за рубяжом, дзе вывучалі такі вопыт. Наведваў з гэтай мэтай Венгерскую Народную Рэспубліку і адзін з аўтараў гэтых радкоў. Удзельнічалі работнікі нашай бібліятэкі і ў савецка-чэхаславацкім семінары бібліятэчных работнікаў у Маскве.

Часта прымаюць замежных бібліятэкараў і ў нашай рэспубліцы. У госці да нас, у Беларусь, прыязджала вялікая група бібліятэчных работнікаў — турыстаў з ГДР. Яны з вялікай цікавасцю пазнаёміліся з работай нашай бібліятэкі, а потым сустрэліся ў Таварыстве дружбы і культурных сувязей з зарубежнымі краінамі, з прадстаўнікамі бібліятэчнай грамадскасці Мінска. Цёплыя, дзелавыя размовы ўзбагацілі і нас і нашых нямецкіх калег.

Наша бібліятэка працуе ў цесным кантакце з Таварыствам дружбы і культурных сувязей з зарубежнымі краінамі. Сумесна мы арганізоўваем выстаўкі міжнароднай кнігі, якія карыстаюцца вялікай папулярнасцю чытачоў. Напрыклад, з поспехам прайшла выстаўка французскай дзіцячай кнігі, выстаўка навукова-тэхнічнай кнігі Польшчы і г. д. На святах кнігі прысутнічалі прадстаўнікі адпаведных зарубежных краін. Потым яны знаёміліся з пастаноўкай бібліятэчнай справы ў рэспубліцы. Зараз разам з Таварыствам мы рыхтуем вялікую выстаўку в'етнамскай кнігі, якая будзе адкрыта ў дні в'етнамскай культуры ў Беларусі ў ліпені гэтага года.

Чытальныя залы нашай бібліятэкі шырока адкрыты не толькі для савецкіх, але і замежных грамадзян, якія вучацца ў вышэйшых навучальных установах Мінска, і для тых, хто прыязджае ў нашу сталіцу ў навуковыя камандзіроўкі. Пастаянныя чытачы чытальнай залы — студэнты БДУ, якія прыехалі з В'етнама, афрыканскіх і іншых краін. Замежных навуковых работнікаў цікавіць у першую чаргу беларускі аддзел, у якім ёсць буйнейшыя калекцыі нацыянальнай літаратуры, патрэбныя даведнікі.

Адна з крыніц сувязі нашай бібліятэкі з зарубежнымі бібліятэкамі — гэта міжнародны абанемент і міжнародны кнігаабмен.

Па міжнароднаму абанементу наша бібліятэка звязана з 14 зарубежнымі бібліятэкамі. Многія нашы чытачы карыстаюцца паслугамі гэтага абанемента. Найбольшая колькасць заявак на беларускую літаратуру прыходзіла з Дзяржаўнай тэхнічнай бібліятэкі ЧССР, Нацыянальнай бібліятэкі ГДР, універсітэтаў Варшавы, Лейпцыга, Берліна, Будапешта. Прысылала заяўкі і бібліятэка Льежскага універсітэта (Францыя).

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна прыступіла да актыўнага міжнароднага кнігаабмену ў 1958 годзе. А летась мы правялі абмен выданнямі з 102 бібліятэкамі і навуковымі ўстановамі 25 краін свету. Сярод іх 29 бібліятэк, 8 акадэмій навук, 15 універсітэтаў, 17 спецыялізаваных устаноў, 27 інстытутаў, 6 рэдакцый часопісаў.

У капіталістычных краінах мы найбольш звязаны з Бібліятэкай Кангрэса (ЗША), Бібліятэкай Брытанскага музея (Англія), Нацыянальнай бібліятэкай Францыі, бібліятэкамі Канзаскага (ЗША) і Упсальскага (Швецыя) універсітэтаў. Заказваем у асноўным кнігі са звесткамі аб Беларусі, а таксама пераклады твораў беларускіх аўтараў на замежныя мовы і г. д.

Самыя цесныя сувязі па абмену ў нас з нацыянальнымі бібліятэкамі Польшчы, Балгарыі, Чэхаславакіі, ГДР. З гэтымі, а таксама з некаторымі іншымі бібліятэкамі сацыялістычных краін у нас ёсць пагадненні высылаць усе буйныя работы, не чакаючы канкрэтных заказаў. Гэта дае магчымасць весці больш аператыўны абмен і пазбягаць непатрэбнай перапіскі. Паводле такіх пагадненняў, заключаных з Бібліятэкай Народовай (ПНР) і Славянскай Кнігоўнай (ЧССР), мы высылаем ім, апрача навуковых кніг, навінкі мастацкай літаратуры на беларускай і рускай мовах. Шмат заказаў на літаратуру на беларускай мове робіць нам Галоўнае ўпраўленне Беларускага грамадска-культурнага таварыства і рэдакцыя газеты «Ніва» ў Беластоку (ПНР).

З году ў год расце і колькасць беларускіх часопісаў, што адпраўляюцца за мяжу. «Летапіс друку БССР», які выдаецца нашай бібліятэкай, ідзе ў 61 адрас 25 краін свету. Шмат заказаў на часопіс «Новыя кнігі БССР», навуковыя часопісы. Замежныя чытачы праяўляюць усё большую цікавасць да грамадска-палітычных, літаратурна-мастацкіх выданняў. Так, часопіс «Коммунист Белоруссии» высылаем у чатыры адрасы, «Полымя» атрымліваюць Брытанскі музей (Англія), Каралеўская бібліятэка Швецыі, бібліятэкі Канзаскага і Каліфарнійскага універсітэтаў (ЗША), бібліятэка Упсальскага універсітэта (Швецыя), нацыянальныя бібліятэкі і шэраг іншых устаноў сацыялістычных краін. Гэта ж можна сказаць і пра часопісы «Беларусь», «Маладосць», «Неман».

Высылаем за мяжу і беларускія газеты. Напрыклад, газета «Літаратура і мастацтва» ідзе ў чатыры адрасы, у тым ліку і ў Упсальскі універсітэт (Швецыя), газета «Звязда» — у Брытанскі музей, газета «Советская Белоруссия»—у Французскую нацыянальную бібліятэку.

Усяго ў мінулым годзе мы паслалі за мяжу 2090 беларускіх кніг, 2136 часопісаў, 14 гадавых камплектаў газет. У абмен атрымалі 956 кніг, 3093 часопісы і 17 гадавых камплектаў газет.

Тысячы кніг, часопісаў і газет, якія ідуць у розныя куткі свету, дапамагаюць зарубежнаму чытачу зведаць праўду аб нашай краіне, Беларусі, пазнаёміцца з вялікім прагрэсам, якога дасягнуў наш народ у развіцці эканомікі, навукі і культуры. Інтэнсіўны абмен кнігамі робіць сваю добрую справу— садзейнічае збліжэнню людзей розных нацыянальнасцей, нясе людзям святло ведаў і праўды. Мы будзем імкнуцца рабіць усё, каб кніжныя патокі цяклі яшчэ больш магутна і паўнаводна.

І. САНКОВА,
намеснік дырэктара Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна.

І. ЖОЛУДЗЕЎ.
загадчык аддзела замежнай літаратуры.

МАСТАЦТВАЗНАЎЦЫ АБАРАНЯЮЦЬ ДЫПЛОМЫ

22 чэрвеня ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце адбылася абарона дыпломных работ выпускнікоў завочнага аддзялення мастацтвазнаўства.

Надзённым праблемам развіцця беларускага савецкага выяўленчага мастацтва прысвечаны работы выпускнікоў інстытута Ул. Святлова («Тэматычны жыванпіс на рэспубліканскай выстаўцы твораў мастакоў, прысвечанай 50-годдзю Кастрычніка»), М. Шабеты («Мемарыяльныя помнікі Савецкай Беларусі 60-х гадоў»), Т. Ляўковай («Тэма партызанскай барацьбы ў жывапісе Савецкай Беларусі»), Л. Белікавай («Партрэт у беларускім пасляваенным жывапісе»).

Некаторыя дыпламанты стварылі манаграфічныя даследаванні аб творчасці сучасных беларускіх мастакоў: В. Вярсоцкі—пра Х. Ліўшыца, Ю. Гільдэнберг—пра А. Паслядовіч, Л. Салавей—пра Р. Кудрэвіч.

М. Забораў у сваёй дыпломнай рабоце даследуе некаторыя прынцыпы аналізу твораў выяўленчага мастацтва.

Шэраг работ прысвечаны пытанням развіцця дэкаратыўна-прыкладнога і народнага мастацтва. Л. Сівакова напісала работу «Народнае ткацтва Магілёўскай вобласці», Л. Сакалова—«Скарыстанне народных традыцый у сучасных тканых дыванах Беларусі». Работа В. Фурмана прысвечана вытворчасці і мастацкаму афармленню ільняных жакардавых тканін Аршанскага ільнокамбіната. Ф. Янковіч даследаваў мастацкае афармленне сучасных дэкаратыўных тканін для мэблі і драпіровак. Адзенне казакаў-некрасаўцаў, якія жывуць на Кубані, даследавана ў рабоце В. Кошалевай.

Работы выпускнікоў-мастацтвазнаўцаў атрымалі адзнакі «добра» і «выдатна».

НАШЫ МАЙСТРЫ МАСТАЦТВА

НА ХВАЛІ ДУШЭЎНАЙ БЛІЗАСЦІ



ШЧЫРА кажучы, я не вельмі прыглядаўся да гэтага артыста, калі бачыў яго на экране. А здымаўся ён даволі часта і ў даваенны час, і параўнальна нядаўна.

Цяпер, калі Пятро Філіпаў працуе разам са мной у трупе Гродзенскага абласнога тэатра, я зноў успамінаю фільмы з яго ўдзелам і абавязкова йду глядзець іх, — дакладней, глядзець «яго» ў фільмах, «Рыбакі Арала», «Гульбахар», «Свяшчэнная кроў», «Дзеля жыцця» — вось назвы кінастужак, якія прыцягваюць маю ўвагу, бо я знаёмлюся з маім цяперашнім партнёрам па сцэне, як кажуць, «у іншым ракурсе».

І адкрываю ў ім шмат для сябе нечаканага: аказваецца, яму вельмі ўласціва, я сказаў бы, адчуванне цэльнасці характару. Чаму — «аказваецца»? Ды таму, што ў тэатры, як вядома, мы пачынаем працу над ролямі з дэталяў. Рэжысёры звычайна адразу пасля таго, як ахарактарызуюць персанаж, пачынаюць дзяліць яго паводзіны на асобныя «задачы», вызначаючы ў кожнай «скразное дзеянне». Карацей, у тэатры я часцей за ўсё назіраю, як той жа П. Філіпаў лепіць вобраз, выходзячы з аналізу. А на экране — сінтэз. Гэта значыць, што акцёр на здымачнай пляцоўцы быў кожную мінуту ўнутрана падрыхтаваны да таго, каб пачаць «жыць у вобразе» адразу ж пасля каманды: «Матор!»

Прыхільнікі нашага тэатра — і не толькі ў Гродна — ведаюць П. Філіпава па разнастайных сцэнічных вобразах, але больш за ўсё, мабыць, запамінаецца ён у ролях вайскоўцаў. «Сакрэт» тут даволі звычайны—П. Філіпаў яшчэ напярэдадні Вялікай Айчыннай, адразу пасля таго, як скончыў студыю пры тэатры імя Арцёма ў Данецку, апрануў бушлат і бесказырку.

Сем урадавых узнагарод было на грудзях бывалага марака, калі ён пасля доўгага перапынку зноў з'явіўся ў тэатры. Было гэта ў горадзе гарнякоў Кемераве. Пасля П. Філіпаў ужо ў якасці вядучага артыста працуе ў тэатры Савецкай Арміі Сярэдне-Азіяцкай ваеннай акругі. У рэпертуарным спісе яго з'яўляюцца ролі з п'ес Б. Лаўранёва, С. Міхалкова, В. Гусева, Л. Рахманава, С. Смірнова, М. Пагодзіна.

Мабыць, «Крэпасць над Бугам» — спектакль, дзе П. Філіпаў стварыў вобраз Антона Задарожнага, — і «паклікаў» яго ў родную Беларусь. Сем гадоў ён працуе ў Гродна. Мне даводзілася разам з ім іграць у розных спектаклях, разам шукаць найбольш яркія сцэнічныя выразнасці дуэтных сцэн, сачыць за тым, як выкрышталізоўваецца ў яго арыгінальны партрэт сучасніка ці героя класічнай п'есы. Спачатку мне здавалася, быццам для П. Філіпава «ўсё» бывае схавана ў дробязях, у дэталях і нюансах паводзін таго або іншага персанажа. Калі я ўбачыў яго на экране, філіпаўская праца над вобразам, філіпаўскі почырк сталі больш блізкімі мне. Я пераканаўся, што мой таварыш умее «схапіць» характар ва ўсіх яго супярэчлівых сувязях з тымі, хто побач з ім.

Зразумела, гэта банальна — гаварыць, што прызапашаныя на дарогах жыцця ўражанні і ёсць той грунт, на якім будуецца сцэнічны вобраз. Але ж у дачыненні да П. Філіпава такая характарыстыка «акцёрскай кухні» вельмі дакладная. Скажам, спытайце ў яго, адкуль ён пачэрпнуў тыя трапныя інтанацыі і своеасаблівую жэстыкуляцыю, якія ўласцівы яго палкоўніку Рубцову ў драме «Перабежчык» П. і А. Тураў, і артыст успомніць сапраўднага маёра Прыткова, з якім ён разам ваяваў і лёс якога ў нечым падобны да лёсу героя п'есы. Не, гэта не капіраванне, аднак жа многае ў манеры весці допыт палонных, ставіцца да падначаленых і да сваіх камандзіраў П. Філіпаў якраз і «ўзяў» у свайго франтавога друга. Не ў аднаго яго, вядома, але ж тая «разынка», што надае вобразу індывідуальны характар, падказана акцёру «памяццю сэрца».

«Памяць сэрца» — заўсёды добрая крыніца натхнення і пошукаў мастака. Толькі абмяжоўвацца ёю нельга. Бо, па-першае, тады няма гарантыі ад самапаўтораў, г. зн. штампу, а па другое, і яна ж абмежаваная. Скажам, на гродзенскай сцэне П. Філіпаў сыграў ужо каля паўсотні роляў. Яму памагалі быць у кожнай новай ролі **новым** талент і багацце жыццёвага вопыту. Ды не толькі яны, а яшчэ творчы імпэт мастака, той неспакой, без якога кожны выхад на сцэну толькі паўтаранне добра вывучанага ўрока.

Вось П. Філіпаў запаўняе зусім чыстую старонку сваёй сцэнічнай біяграфіі — яму прадстаіць іграць Антона Яраша ў інсцэніроўцы рамана І. Шамякіна «Сэрца на далоні». Пятро Паўлавіч шчыра прызнаваўся калегам і рэжысёру А. Струніну, што ён мае толькі кніжныя ўяўленні пра атмасферу падпольнай барацьбы народных мсціўцаў.

— Мой герой — урач. Што ж, некалі я сам вучыўся на медыцынскім, ведаю тое-сёе. Але ж мне патрэбна засвоіць псіхалагічна ўсе ходы ў думках і ўчынках Антона Яраша. Як ён трымае свае рукі пасля аперацыі? Пра што яму думаецца, калі ў яго — і літаральна, і метафарычна — сэрца на далоні? Разумею, што за кожнай рэплікай-адказам на, здавалася б, «сюмінутныя» пытанні ёсць яшчэ і «другі план», — а як гэты план перадаць, калі ты — прафесіянальны медык і патрабавальны да сябе грамадзянін?

Рэпетыцыі і праходзілі ў пошуках адказаў на гэтыя пытанні. І на кожнай у П. Філіпава з'яўлялася для яго герою новыя штрыхі. Бывала, нам хацелася апладзіраваць яму. «Адкуль гэта?» — здзіўляліся калегі. Часцей, чым раней, мы бачылі акцёра разам з дырэктарам тэатра, а ён, Іван Міхалюта, — былы партызан. І вось П. Філіпаў дапытліва «вадзіў» яго па незабыўных сцежках мінулага, каб глыбей адчуць, што такое падпольшчык, народны мсціўец. Гродзенскі хірург Ніціцін адкрыў акцёру дзверы сваёй аперацыйнай, і там, апрануты ў белы халат, будучы Антон Яраш таксама спасцігаў нешта важнае для сябе.

Усё гэта ўваходзіла не толькі ў арсенал знешніх паводзін сцэнічнага героя, рабілася «сваім» для акцёра, натуральным і адзін. на патрэбным у яго паводзінах. Самае галоўнае — была знойдзена мастацкая ўзгодненасць паміж унутраным станам Яраша і яго манерай трымацца ў бальніцы, сярод сяброў, у сутычках з праціўнікам. Акцёр быў пераканаўчы і арганічна паводзіў сябе і ў эпізодах, дзе Антон выступае зусім маладым падпольшчыкам, і тады, калі яго герой прадстае перад намі ўжо сталым чалавекам. Гэта быў цудоўны партрэт сучасніка.

Па-акцёрску П. Філіпаў вельмі шчодры — для яго не існуе «другарадных» паказаў. На мінскай сцэне ці на падмостках калгаснага клуба — ён заўсёды сабраны і аддае ролі ўвесь напал пачуццяў. Гэта, як правіла, перадаецца партнёрам — і таму, каго стаміла дальняя дарога, і таму, хто прыйшоў на сцэну пасля напружанай рэпетыцыі.

Аднойчы ў гастрольную пару мне давялося разам з Пятром Паўлавічам завітаць у ягоную родную вёску Патаронаўку на Магілёўшчыне. Я глядзеў, з якім хваляваннем шыбаў ён па вуліцы ад хаты да хаты, і мне здалося, што нават першыя вячэрнія зоркі над лесам ён разглядае, як свае, патаронаўскія, зямляцкія. Было ў гэтым нешта ад таго Філіпава, якім я яго ведаю на сцэне.

Зараз, калі мы гастраліруем у Мінску, экзамен на сталасць трымае ўся трупа тэатра і кожны з акцёраў. Мяркуючы па тых апладысментах, якія выпадаюць на долю Пятра Паўлавіча, можна сцвярджаць, што яго творчасць абуджае ў гледачоў шчыры водгук. Створаныя ім вобразы — гэта людзі, чыё жыццё захапляе. Сталічны гледач, я ўпэўнены ў гэтым, яшчэ раз пераканаўся, што майстэрства, уласцівае Філіпаву, дае яму права на тое высокае званне, што яму нададзена,—званне заслужанага артыста рэспублікі.

Уладзімір ДЗЁМІН,
артыст Гродзенскага абласнога тэатра.

З пошты ЛіМа

ДОБРАЯ Ў СЛУЦКУ БІБЛІЯТЭКА

Вы спяшаецеся, вам няма часу. А трэба памяняць у бібліятэцы кнігу. Тады набярыце нумар тэлефона Слуцкай цэнтральнай гарадской бібліятэкі і зрабіце заказ. У наступны раз зайдзіце, і бібліятэкары пададуць вам патрэбную кнігу: «Калі ласка». Калі ж вы не ведаеце, што лепш пачытаць, вам параяць, падкажуць. Ну, а калі хварэеце і не можаце самі прыйсці, пазваніце ў бібліятэку, назавіце свой адрас, і кнігу вам прынясуць дадому.

Так уважліва адносяцца да чытача ў бібліятэцы. Тут часта праводзяцца кніжныя выстаўкі, канферэнцыі чытачоў, тэматычныя вечары, агляды па кнігах, афармляюцца стэнды.

Асабліва мнагалюдна бывае на тэматычных вечарах. Цікава прайшлі такія вечары, як «Ніхто не забыты, нічога не забыта», «Аб тых, хто не дажыў, не дапеў, не дакахаў», «Змагары за народнае шчасце» і іншыя. На іх звычайна выступаюць ветэраны рэвалюцыі, Вялікай Айчыннай вайны, перадавікі вытворчасці. Напрыклад, на вечар «Змагары за народнае шчасце» былі запрошаны ўдзельнікі партызанскага руху на Случчыне.

Часта праводзяцца і канферэнцыі чытачоў. Вось і нядаўна прайшла канферэнцыя па раману А. Чарнышэвіча «Світанне». Чытачы прынялі актыўны ўдзел у абмеркаванні кнігі.

Загадчыца бібліятэкі Зінаіда Міхайлаўна Яновіч паказвае мне альбом «Пра нас пішуць». Гэта своеасаблівая гісторыя культасветустановы. Яе працягваюць пісаць штодзённа сціплыя, чулыя людзі— бібліятэкары. За гэта ім удзячны мы, чытачы.

А. РАМАНОВІЧ,
рабочы ПМК-56 трэста «Слуцксельбуд».

СТУДЫІ ТРЭБА ПАМАГЧЫ

Дзесяткі два мінскіх школьнікаў — ад васьмі да семнаццаці — збіраюцца двойчы на тыдні ў адным з пакойчыкаў сталічнага Палаца прафсаюзаў на заняткі студыі выяўленчага мастацтва. Дакладней, у пакойчыку — зімою, а з прыходам вясны — часцей на ўлонні прыроды.

Некаторыя з былых выхаванцаў гэтай студыі вучацца сёння ў мастацкіх навучальных установах. Мараць пра гэта і многія сёлетнія выпускнікі.

Кіруе студыяй Георгій Уладзіміравіч Камлюк. Яму і яго выхаванцам даводзіцца пераадольваць пэўныя цяжкасці арганізацыйнага парадку. Пакойчык студыі малы, недастаткова асветлены. Няма мальбертаў. Нестае фарбаў, паперы. Сродкі ёсць, а вось набыць няма дзе. Мабыць, трэба кіраўніцтву Палаца прафсаюзаў дамовіцца з Саюзам мастакоў БССР, каб для студыі можна было набываць неабходныя матэрыялы праз кіёск Мастацкага фонду. Можна, напэўна, знайсці і іншыя шляхі цэнтралізаванага забеспячэння студыі ўсім неабходным для заняткаў, каб не даводзілася кіраўніку і студыйцам бегаць па горадзе ў пошуках ватману і добрых фарбаў.

Н. СТРЫЖАК.

М. БРУХАНАЎ. «Славянскі марш». (Масла).

УСЛАЎЛЯЮЧЫ МОЦНЫХ ДУХАМ

НАВАПОЛАЦК, як вядома, горад малады. Але ў ім ужо складваецца калектыў мастакоў. У прасторным Палацы культуры тут адбылася нядаўна выстаўка іх твораў.

Ядро ўсёй экспазіцыі склалі работы Мікалая Бруханава.

Гэта таленавіты мастак. Ён настойліва працуе, пра што сведчаць шматлікія эцюды, якіх у яго майстэрні — мноства.

Пейзажы М. Бруханава—абагульненыя карціны прыроды з па-свойму асэнсаванай натурай. Вось, напрыклад, «Блакітная маўклівасць» —рытмы горных алтайскіх кражаў, непаўторная суровасць сібірскіх высакагор'яў. «Сёмінскі перавал»—сакавітая буйная зеляніна алтайскіх гор, прарэзаная лімонна-жоўтымі ўспышкамі траў і кветак...

М. Бруханаў аддае перавагу шырокай манеры пісьма, што адпавядае яго тэмпераментнай натуры. Ён любіць падкрэслена магутныя, манументальныя формы. Гэта выразна відаць і ў названых пейзажах, і нават у яго нацюрмортах. Вось адзін з іх: на свежавыструганым стале — аржаны бохан хлеба, адрэзаныя нажом скібкі. Мастак падкрэслівае паўнату жыцця ў самых звычайных яго праявах.

Разглядаючы пейзажы, нацюрморты, шматлікія эцюды М. Бруханава, не можаш не чакаць многага ад яго тэматычных карцін. Вось «Даяркі». На лімонным вясновым фоне, што прарэзаны чарнатой дарогі, узвышаюцца на возе тры белаватыя жаночыя постаці. Тут не выпадковы ракурс: асноўная ўвага засяроджваецца не на жанравым моманце «падарожжа» малочніц па сельскім пасёлку, а імённа на саміх працаўніцах. Яны выглядаюць як гаспадыні — упэўненыя ў сваёй жаночай прывабнасці, у значнасці спраў, якія твораць сваімі рукамі.

Лірычная кампазіцыя «Бярозкі» — на зялёным фоне вясны сярод светлых вертыкаляў ствалоў жаночыя фігуры. Стройны рытм, адчуванне радасці...

М. Бруханаў у розных праявах жыцця шукае глыбокі сэнс. Асабліва адчувальна гэта ў кампазіцыі «Апафеоз вайны». Разглядаючы палатно, пранікаешся грозным пафасам трагедыі, якая прайшла па зямлі. Сімвалічныя фігуры — бесцялесныя цені мінулай вайны — прыўзняты над натоўпам фашыстаў, які рухаецца, кішыць, як муравейнік. Уся тканіна гэтага графічна скупога палатна саткана з чорных, шэрых і чырвоных плям і ліній — змрочная гармонія ваеннай палітры.

А вось палатно «Ветэран вайны». Мастак піша пажылога чалавека з сынам на руках. У палінялай гімнасцёрцы былы воін стаіць на фоне вогненна-чырвонага святочнага салюта. Успаміны, якія крыху прытупіліся ў мірны час, зноў разверадзіў грукат гарматных залпаў — і ад гэтых успамінаў нялёгка вызваліцца. Ды ці трэба?.. А хлапчук цягнецца рукой да «сувеніраў» вайны — узнагарод за храбрасць і доблесць, якія пабліскваюць у агні салюта. Натуральная бесклапотнасць дзіцяці — кантраст да напружанага ў нялёгкіх думках твару салдата. У надзейных руках былога воіна будучыня сына... Каларыстычны лад карціны напружаны, пабудаваны на яркіх кантрастах. Ён добра адпавядае ўнутранаму сэнсу твора.

Нядаўна мастак завяршыў работу над яшчэ адной карцінай аб вайне і міры — «Славянскі марш».

Гэтую работу нельга назваць ні гістарычным палатном, ні жанравым творам, ні групавым партрэтам, паколькі тут няма вызначанай храналагічнымі або бытавымі рамкамі падзеі.

На фоне суровых і сціплых твараў жонак, маці, сясцёр, што праводзяць сваіх блізкіх на вайну, — профілі трубачоў, што абвяшчаюць аб пачатку вялікіх выпрабаванняў і аб будучай перамозе. Гэта быццам гімн-рэквіем суровым выпрабаванням, якія выпалі на долю братніх славянскіх народаў на працягу гісторыі. Аўтар пазбягае другарадных дэталяў. Не разгортвае ён сюжэт у перспектыве і прасторы, абмяжоўваючыся плоскасным адлюстраваннем. Гэта дазваляе засяродзіць увагу на змесце карціны. Іменна на змесце, а не на сюжэце. Мастак, які любіць насычаныя каляровыя супастаўленні, на гэты раз ён свядома адрокся ад яркасці. У даным выпадку яркасць лёгка магла б перайсці ў залішнюю патэтычнасць. Далікатнасць каляровага рашэння дазволіла жывапісцу дакладна арганізаваць танальную структуру палатна. Варыяцыі шэрых, чорных, светлых ліній, якія канструіруюць формы, зрабілі манахромнасць палатна па-свойму маляўнічай.

Цікавая і новая работа М. Бруханава — «1918». Тут мы бачым правадыра Кастрычніцкай рэвалюцыі. Буйная, на ўвесь фармат палатна, постаць Леніна, які схіліўся над сталом. Твар правадыра засяроджаны ў глыбокім роздуме пра лёс Расіі. Фігура правадыра вылеплена экспрэсіўнымі, шчыльнымі і шырокімі мазкамі. У саміх прыёмах пісьма падкрэслена напружанасць і ўнутраная засяроджанасць Ільіча. Кантрасты свету і цені, якія мадэліруюць твар, як бы гавораць аб складанасці пошукаў тых рашэнняў, якімі заклапочаны Ленін.

У апошні час мастак шмат працуе над эскізамі манументальных роспісаў для інтэр'ераў і знешняга афармлення будынкаў Наваполацка. Ён ужо выканаў у матэрыяле чорна-белы мазаічны партрэт У. І. Леніна для канферэнц-залы гаркома партыі.

На жаль, М. Бруханаў не можа ажыццявіць іншыя свае задумы па ўжо закончаных цікавых эскізах. І прычыны, якія перашкаджаюць гэта зрабіць, далёкія ад чыста творчых праблем: у маладым горадзе пакуль што цяжка з фінансаваннем манументальных работ.

Б. ШЫШЛО.

Надрукавана ў «Маладосці»

ЖЫВЕ Ў ЗАГРАДДЗІ ЖАНЧЫНА...

Сёлета ў сакавіцкай кніжцы «Маладосці» надрукавана аповесць Уладзіміра Паўлава «Спелыя травы». Гэта не першае выступленне паэта ў жанры прозы. Два гады назад, і таксама ў «Маладосці». У. Паўлаў дэбютаваў як празаік аповесцю «Яжэліха».

Для мяне, як, пэўна, і для многіх іншых чытачоў, з'яўленне «Яжэліхі» было нечаканасцю. Праўда, такую «здраду» лёгкакрыламу Пегасу мы назералі ў апошнія гады ў многіх паэтаў, але то былі звычайна паэты старэйшага веку, якіх, як кажуць, «да суровай прозы схіляюць гады». Тут жа выступіў у прозе паэт малады, аўтар двух зборнікаў вершаў, паэт, які, па сутнасці, яшчэ на пачатку сваёй паэтычнай дарогі. Але самае галоўнае было тое, што нечаканасць гэтая аказалася прыемнай: аповесць «Яжэліха» была зусім не кволай спробай пяра, хаця яна і мела свае недахопы (літаратурнае «паходжанне» асобных характараў, сітуацый і эпізодаў, кампазіцыйная рыхлаватасць). Многія старонкі твора былі напісаны рукой проста-такі сталага празаіка. І шкада, што аповесць «Яжэліха» не была заўважана нашай крытыкай.

І вось новая аповесць.

...На золку, як звычайна, падаіла Улляна карову, працадзіла малако ды выйшла ў двор, да калодзежа, даёнку спаласнуць. Аж тут убачыла—ідуць па вуліцы ў белых капронавых сукенках блізняты Хведаравы. «Дзяўчаткі вярталіся з выпускнога вечара. А ёй здалося, быццам не яны гэта, а яна. Улляна, з Волькай, іх нябожчыцай-маці, ацынуліся ў той сваёй золкай раніцы, калі можна, забыўшыся на ўсё, ісці па вуліцы, яшчэ здранцвелай ад сну, прытуляць адной рукой бэз, а ў другой несці белыя лодачкі з засунутымі ў наскі панчохамі і са смелым выклікам тэпаць босымі нагамі па халодным і мяккім, як попел, пяску».

Забылася Улляна пераліць з вядра ваду ў даёнку, апусціла рукі, задумалася. Няўжо гэта столькі гадоў праляцела? Няўжо тое было так даўно? Здаецца ж, і азірнуцца не паспела, а во—сіроты Вольчыны нявестамі сталі.

Дык от, шмат гадоў назад, таксама такой вось парой—чэрвеньскай золкай раніцай—вярталася яна з Волькаю дадому. І таксама з выпускнога вечара. Не зусім, праўда, разам з Волькай. Волька ішла пацерадзе, бо яе, Улляну, праводзіў іх класны кіраўнік Раман Раманавіч, якога ўсе яны, дзесяцікласніцы, пабойваліся. Увесь вечар танцаваў ён з Уллянай, а пасля і ў праважатыя напрасіўся... Прагнала яго Улляна. Непадалёк ад вёскі сустрэў яе Пашка—загадчык клуба. Вясёлы быў хлопец, разумны і дасціпны, хоць маці і казала пра яго: «Мятла ты і толькі!» Той раніцай Пашка сказаў ёй: «Уля, я люблю цябе...» Больш ёй ніхто такога не гаварыў. А яна? Мусібыць, таксама яго любіла, бо вось жа—колькі гадоў мінулася, а памятае. І не так словы ягоныя, як тое, як яны былі вымаўлены. А яна, дурніца, паказала тады хлопцу язык.

Не ведала яшчэ, тады той раніцою, Улляна, што ўжо каціліся на іхняе Заграддзе навальніца. Ды хіба толькі на Заграддзе! На краіну насоўвалася, паўзла фашысцкая нечысць. І не на дзень, не на два, а на доўгія і сляпыя, як восеньскія ночы, гады...

Гэта—пачатак аповесці. Нягледзячы на тое, што аўтарам знойдзены адпаведная інтанацыя расказу, паасобныя трапныя дэталі, усё ж тут, у самым пачатку, вельмі празрыстыя літаратурныя рэмінісцэнцыі. Гэта ж можна сказаць увогуле пра ўвесь першы раздзел аповесці—«Сухмень».

Гаворыць Пашка з Нічыпарам, бацькам Ульляны, пра тое, што немцы ўжо ў Югаславіі, што быць таго не можа, каб тая карычневая саранча асмелілася рынуцца на Савецкую краіну; дзядзька Сяргей, па прозвішчы Атаманавіч, Пашка, піянерважаты Ваня Чакай, Улляна з бацькам высочваюць здраднікамлынара, што падае з ракетніцы сігналы фашысцкім самалётам; Нічыпар і Ахрэм гоняць на ўсход калгасны статак, але, дайшоўшы да разбомбленай пераправы цераз раку, паварочваюць назад нядоеных кароў; маладыя хлопцы-камсамольцы, узброеныя чым папала, ловяць фашысцкіх дыверсантаў-парашутыстаў... Пра ўсё гэта расказана даволі ўмела і шчыра, ўсё гэта чытаеш нават з пэўнай цікавасцю, аднак цябе не пакідае адчуванне, што нешта такое ці падобнае ты ўжо недзе чытаў.

Больш змястоўны і самастойны другі раздзел аповесці—«Акупацыя». Праўда, і тут некаторыя старонкі маюць налёт літаратуршчыны. Перш за ўсё маю на ўвазе тыя старонкі, на якіх падаюцца эпізоды партызанскай барацьбы з фашысцкімі акупантамі. Тут фантазія маладога празаіка часам не выходзіць за межы таннага прыгодніцтва. Затое побыт людзей, жыццё Заграддзя пад акупацыяй пададзены дакладна, пераканаўча, густа.

Аднак цэнтр цяжару аповесці, калі так можна сказаць, апошні, трэці раздзел—«Па закону—прывет паштальёну...»

Загінуў вечны аптыміст Пашка; склаў галаву неспакойную Ваня Чакай; памёрла, недагледжаная ў блакаду, маці; у адзін дзень з ёю сканала ад родаў сяброўка Волька, пакінуўшы дзвюх дзяўчынак-блізнятак сіротамі; стаў партызанам Федзя Мукавозчык і, вярнуўшыся ў Заграддзе разам з атрадам, выконвае людскі прысуд над родным бацькам.

Улляна неяк выжыла ў той завірусе. Разам з бацькам памагала партызанам. Першы раз хадзіла з Ванем Чакаем у разведку, ды і сама не ведала, што ў разведцы была. Пасля параненых партызан з цёткай Просяй глядзела. А як з блакады выбілася, як прышкрэбалася ў сенцы да Просі, хто і як яе з тыфу выхадзіў—не памятае. Стала на ногі ў сярэдзіне лета — таго лета, як нашы прыйшлі.

А пасля? Што было пасля? Няўжо і праўда было тое першае пасляваеннае ворыва? І такі цяжкі плуг, што яго нельга было павалачы ўчацвярых—Куліне, Просі, бацьку і ёй, Улляне? Быў і пяты памочнік—Мікола Просін. Але што за помач з яго? Птушыны падлетак. Добра, што хоць за плугам пляцецца. Хаця—не. Гэта сённяшняй меркай здаецца Улляне, што быў Мікола дзіцем. А тады—тады Мікола быў ужо не дзіця. Дзеці па тым часе сталелі рана.

А помніш той адліжны вечар, там, у леспрамгасе, калі Мікола рантам прапанаваў табе: «Сёння ў клубе танцы. Сходзім?» Як ты збянтэжылася, як табе стала балюча і крыўдна!

А от жа і сама не заўважыла, як быццам пачала гарнуцца душою да хлопца, да падлетка. Можа і не тое што гарнуцца: мусіць, проста збудзілася нешта ў сэрцы. Можа, напамінак пра Пашку?

Некалькі разоў заходзіў да іх у хату Федзя Мукавозчык. Яна думала: «Чаму людзі не хочуць лічыцца з яе спадзяваннямі? Няўжо ўсе думаюць, што зайшло яе сонца, што яна застанецца ў Заграддзі навечна, прыкарэе да дому. Паправіцца бацька — і яна рынецца ў вялікі свет, які пачынаўся адразу за палеткам, за лесам. Яна сваё дагоніць. Яна ж яшчэ маладая». А Федзю сказала: «Ой, Федзечка, сорам ад людзей будзе. Скажуць, што пайшла за сяброўчынага мужыка. Падумаюць, што я вам з Волькай ліха жадала...»

І яшчэ прайшлі гады. Улляна касіла, жала, палола, грабла сена, глядзела бацьку. А ў душы жыла ўсё ж тая — дзявочая ці горка-ўдовіна? — думка-спадзяванка...

Менавіта тут, у апошнім раздзеле аповесці, у самотна-шчымлівым расказе пра пасляваенны лёс Ульляны, У. Паўлаў паўстае перад намі ўдумлівым празаікам, дакладным у дэталях, ашчадным у словах і эмоцыях, тонкім у перадачы чалавечага пачуцця і настрою. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова прачытаць хоць бы тое, як Мікола з Уллянай валяць дубы і грабы, як Мікола прыносіць гаспадыні сям'ю дзікіх пчол альбо як праганяла яго маці дубцом з застолля, калі Улляна з бацькам спраўлялі навасёлле...

Жыве ў Заграддзі жанчына. Жыве, працуе, пэўна, часам і радуецца сваім і чужым радасцям, а душа, апаленая вайною, усё баліць, усё шчыміць і ные. Пройдуць і яшчэ гады, а ці аціхне калі-небудзь гэты боль, ці перастане адгукацца ў сэрцы нязбытным смуткам па адабранай радасці, спакою, шчасці? А колькі такіх Уллян параскідачы па іншых беларускіх Заграддзях і Залессях, Заполлях і Зарэчах?..

Гэта — не рэцэнзія на аповесць «Спелыя травы». Прачытаўшы яе, проста захацелася падзяліцца з іншымі сваёй радасцю ад таго, што ў літаратуру нашу ідзе цікавы, самабытны празаік — Уладзімір Паўлаў. Добрага яму шляху!

Мікола ГІЛЬ.

54 СТАРОНКІ ПРА КАНЦЭРТ

У серыі «Мастацкай самадзейнасці» выдавецтва «Беларусь» выпусціла кнігу музыказнаўцы К. Сцепанцэвіч «Беларускі канцэрт».

Першы яе раздзел — гэта гістарычны нарыс, які ахоплівае перыяд ад зараджэння жанру канцэрта ў Італіі ў XVII стагоддзі да нашых дзён. Ці патрэбны быў гэты нарыс, ці прынёс ён карысць? Думаю, што не. За апошнія гады ў цэнтральных выдавецтвах выйшла некалькі кніг, даступных масаваму чытачу, і кожны, хто зацікавіцца гісторыяй пытання, можа атрымаць неабходную даведку. Траціць жа вялікую плошчу ў кніжцы, спецыяльна прысвечанай беларускаму канцэрту, наўрад ці варта было. Тая ж частка першага раздзела, што прысвечана гісторыі канцэрта ў беларускай музыцы, патрэбная і карысная. Сабраныя разам звесткі паказваюць, як шмат пасцелі зрабіць нашы музыкатворцы.

Аднак і гэтыя старонкі вымушаюць выказаць аўтару рад прэтэнзій. Глыбокага аналізу шляху, пройдзенага беларускім канцэртам за тры дзесяцігоддзі, К. Сцепанцэвіч не робіць. Аўтар абмяжоўваецца пералічэннем прозвішчаў кампазітараў і выканаўцаў і агульнымі разважаннямі, часам не вельмі пераканаўчымі. Фантазія для скрыпкі з аркестрам М. Аладава, напрыклад, параўноваецца з Другім фартэпіянным канцэртам І. Брамса. Параўнанне спатрэбілася толькі для таго, каб сказаць, што абодвы творы чатырохчасткавыя. Пра Фартэпіянны канцэрт Г. Вагнера гаворыцца, што ў ім адлюстраваны «працоўныя подзвігі савецкай моладзі, яе кіпучае жыццё». Далей аўтар спецыяльна спыняецца на разборы твора. Яна гаворыць пра «скерцозна-танцавальную тэму», «карціну таямнічай прыгажуні-ночы», «вясёлае народнае свята». І ні слова пра тое, як жа кампазітар адлюстраваў працоўныя подзвігі моладзі. На старонцы шостай К. Сцепанцэвіч падкрэслівае, што беларускія кампазітары захоўваюць у канцэртным жанры яго спецыфічныя рысы, «якія праяўляюцца ў наяўнасці двайной экспазіцыі». Ніводнага прыкладу канцэрта з двайной экспазіцыяй у кнізе, аднак, няма.

Чатыры раздзелы аўтар аддае разгляду канкрэтных твораў канцэртнага жанру. Аматарам музыкі, наведвальнікам сімфанічных канцэртаў гэтыя старонкі даназюгуць разабрацца ў ідэйнай сутнасці і мастацкіх вартасцях многіх твораў беларускіх кампазітараў. Але і ў гэтай, асноўнай, частцы кнігі шмат што не задавальняе.

Аўтар згрупавала творы па прынцыпу агульнасці салірую-чага інструмента: канцэрты для фартэпіяна, для струнна-смычковых інструментаў, для народных інструментаў, для іншых саліруючых інструментаў. Такая пабудова была б заканамернай, калі б кожны раздзел меў заключэнне, якое выявіла б асноўныя тэндэнцыі развіцця жанру. Абагульненняў жа — няма! А яны вельмі патрэбныя, напрыклад, у раздзеле аб цымбальных канцэртах. Гэты жанр мае для беларускай музыкі асаблівую цікавасць. Напісана цымбальных канцэртаў нямала, і было б вельмі карысна разабрацца, чаму адны творы ўвайшлі ў штодзённы рэпертуар, а другія забыліся. К. Сцепанцэвіч абмяжоўваецца толькі аналізам трох цымбальных канцэртаў, а пра астатнія амаль нічога не гаворыць.

Пабудова раздзелаў па прынцыпу агульнасці саліруючага інструмента прывяла да адчувальных страт: няма храналагізму, агульных характарыстак творчасці таго ці іншага аўтара. Канцэрты Д. Камінскага, напрыклад, прадстаўлены ў трох раздзелах, і ні ў адным падрабязна не аналізуецца шлях, пройдзены кампазітарам, які нямала зрабіў для развіцця беларускага канцэртнага жанру. Характарыстыкі аўтара хутчэй нагадваюць анатацыі, якія звычайна пішуцца да канцэртаў. Калі ж «Беларускі канцэрт» — такі анатацыйны даведнік, дык ён вельмі няпоўны. Затое прынцыповыя ацэнкі ў анатацыях часта падмяняюцца нястрымнымі кампліментамі. Вось што напісана, напрыклад, пра Фартэпіянны канцэрт Г. Вагнера: «З усіх беларускіх канцэртаў для фартэпіяна канцэрт Г. Вагнера, бадай, найбольш яркі па тэматычным матэрыяле, маляўнічасці аркестравага гучання, бліскучай піяністычнай віртуознасці. Вялізны тэмперамент, нястрымны размах фантазіі, гнуткі, рэльефны рытмічны малюнак, агульны эмацыянальна-прыўзняты тонус, пракоф'еўская стальная мелодыка з запалам і скіраванасцю...» (стар. 22). Думаецца, нават самому аўтару твора будзе не па душы такі панегірычны стыль.

Сур'ёзныя прэтэнзіі можна прад'явіць да мовы кнігі. Вось адзін з узораў стылю аўтара: «Волнение и трепетность, как бы прикрытой вуалью, теме побочной партии с широкими, размашистыми шагами в мелодии сообщает пульсирующий ритм аккомпонирующих голосов» (стар. 22—23). Зразумей тут што-небудзь!

Кніжка «Беларускі канцэрт», як ужо гаварылася, выйшла ў серыі «Мастацкай самадзейнасці». Яна, такім чынам, разлічана на людзей, не вельмі знаёмых са спецыяльнай музыказнаўчай тэрміналогіяй. Зусім пазбегнуць спецыяльнай тэрміналогіі, вядома, нельга, але трэба ж мець пачуццё меры! У тэксце на кожным кроку сустракаюцца такія выразы, як «складаная трохчасткавая форма», «амажорная тэма», «дынамічная рэпрыза», «пульсіруючыя тэрцыі» і да т. п.

Чытача не пакідае ўражанне, што аўтар мала шукаў адзінага, незаменнага вызначэння. Пра галоўную тэму першай часткі Другога скрыпічнага канцэрта П. Падкавырава гаворыцца, напрыклад, што яна блізкая «сучаснай масавай песні» (стар. 32). Але варта паглядзець прыведзены тут жа нотны прыклад, каб пераканацца, што ад сучаснай масавай песні гэта тэма вельмі далёкая. Пра другую тэму другой часткі Другога скрыпічнага канцэрта Д. Камінскага сказана, што яна з'яўляецца «глыбокім лірычным адкрыццём» (стар. 35). На самай справе гэта тэма патэтычнага, не лірычнага складу. Першая тэма першай часткі Фартэпіяннага канцэрта Г. Вагнера характарызуецца як «валявая, скерцозна-танцавальная» (стар. 22). Тут адно супярэчыць другому: валявое не можа быць скерцозна-танцавальным, а скерцозна-танцавальнае — валявым.

Крыўдна, што такая бедная аўтарская мова. Слова «цікава», напрыклад, сустракаецца ледзь не на кожнай старонцы: «цікавым жанрам інструментальнай музыкі з'яўляецца канцэрт», «цікавых канцэртаў», «цікавей і шматгранней», «цікавай старонкай», «цікава развівае», «цікавы тэматычны матэрыял», «цікавых твораў», «цікава імітуе», «цікавыя віртуозныя магчымасці»...

Перагорнута апошняя старонка кнігі. Што яна дала масаваму чытачу? Скажам шчыра, не вельмі многа. Затое нарадзіла многа недаўменных пытанняў. Закончым і мы пытаннем: чаму выдавецтва так несур'ёзна паставілася да падрыхтоўкі рукапісу да друку?

Ю. ВУСКОВІЧ.

К. І. Сцепанцэвіч. «Беларускі канцэрт». Серыя «Мастацкай самадзейнасці». На рускай мове. Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1967. 54 стар.

Паэтычная павэрка

Антон БЯЛЕВІЧ

СТАРАЯ ХАЦІНА

Многія сябры ляглі ў магілы,
Не вярнуліся з вайны да хат.
А жыццё ідзе! Спрабуе крылы
Пакаленне новых арлянят.

Не адзін зайшоў — з малым унукам
У хаціну даўняе вясны.
А стаіць там горкая дакука,
Там не пахне смолкаю сасны,
Як тады, даўней, у новай хаце,
Калі мы ўсяляліся ў яе,
Не відаць ні ступы, ні палацяў,
І цвыркун за печчу не пяе...

Разляцеліся па белым свеце
Сёстры і браты. А бацька мой—
У сырой магіле. Вые вецер
Над старой замшэлаю страхой.
А ў самой хаціне — ціха, ціха,
Толькі шашаль шастае ў сцяне...
Хата, хатка! Бедная старчыха,
Не глядзі з дакорам на мяне.

Я зусім ні ў чым не вінаваты:
За палётам юных арлянят
Выляцеў з цябе, нібы з гнязда...
Песні, нібы спелыя зярняты,
Працавітым будням, новым святам,
Дарагім сучаснікам раздамі..

Я іду. Бяжыць малы Алешка.
Мой унук у мой ступае след.
Зараслі майго маленства сцежкі;
Новыя шляхі ў шыроні свет
Сцелюцца, бягуць да небасхілаў
Праз лугі, бярэзнікі, сады...
Поўныя зямной, жывое сілы
Маладыя круглыя гады,
Як на спелым дубе жалуды.

ЖЫВІНКА

Жывінка ў сэрца мне запала,
Як дзіва, як заранка ў небе,
І набухала,
Прарастала,
Нібы гарошына на глебе.

Адчуў яе жывую сілу,
Яе дзівоснае гарэнне.
У сэрцы добра ўскаласіла
Яна натхненне,
Акрыленне;

Дапа палёт высокім марам,
Яны плывуць на белым свеце,
Узяць магу за косы хмару,
Нібы бярэзіну за вецце;

Маланку-шаблю ўзяць магу я,
Магу заткнуць за пояс месяц.
Вясёлку выгну, як дугу я:
Вясёлка стужкі долу звесіць.

Я захачу — валун заплача,
Пралье смалу-слязіну трэска;
Дуброва ўпрысядкі заскача,
Станцуе дуб на пералеску.

Усё магу! Дала мне сілу
Жывінка, поўная зіхцення...
У сэрцы буйна ўскаласіла
Маё натхненне-акрыленне.

У АБ'ЕКТЫВЕ

ФАКТ

НАВАСЕЛЛЕ МЕДЫЦЫНСКАЙ КНІГІ

Днямі ў Мінску адкрыўся першы ў рэспубліцы спецыялізаваны магазін «Медыцынская кніга».

Вялікая светлая гандлёвая зала. Тут многа сонца, кветак на новых стэлажах безліч кніг па ўсіх галінах медыцынскай і біялагічнай навукі. Больш за семсот назваў розных спецыяльных выданняў прапануе новы магазін сваім пакупнікам.

У дзень адкрыцця магазін наведалі сотні ўрачоў, студэнтаў, навучэнцаў медыцынскіх вучылішчаў. Прададзена рознай медыцынскай літаратуры больш чым на 800 рублёў.

Фота Ул. КРУКА.

ВЫЙШЛІ З ДРУКУ

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Іван Бурсаў. Матрошчыны казкі. Малюнкі Н. Шчаснай. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 200.000 экз. 48 стар. Цана 23 кап.

Ядвіга Бяганская. Кожны марыць стаць Калумбам. Выбраныя творы. Малюнкі Ю. Пучынскага. 1968 г. Тыраж 10.000 экз. 256 стар. Цана 51 кап.

Вартавыя Краіны Саветаў. Зборнік песень беларускіх кампазітараў. Складальнік І. Нісевіч. Мастак С. Кавалёў. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 8.700 экз.

В'етнамскія апавяданні. Малюнкі А. Лур'е. 1968 г. Тыраж 8.000 экз. 64 стар. Цана 10 кап.

І. Шпадарук. Бацькавіны за народную справу. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 5.000 экз. 112 стар. Цана 14 кап.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ПАХ ЖЫВІЦЫ

Усе, каму даводзілася бачыць Баркіна, помняць невялічкага вяртлявага чалавечка, які, здаецца, вечна—дзе і браўся дух у гэтым намоглым целе? — толькі і ведаў, што ўвіхаўся каля сваёй дымнай смалакурні, папраўляў адно і на хаду рамантаваў другое, закупорваў са смалой і шкіпінарам бочкі і адпраўляў на бліжэйшую станцыю.

У тыя гады смалзавод стаяў на Ухвале, за дванаццаць вёрст ад цяперашняга. Пры ім Баркін меў невялічкую, скіданую на скорую руку хатку — каб паставіць новую, прасторную святліцу проста-такі не хапала часу — і ўсім здавалася, што ён бы прыкіпеў да смалярні, бо дняе і начуе на ёй. Калі ён сыходзіў з гары ў магазін ці на кірмаш—смалзавод стаяў за ракой, на высокім месцы — ён не спяшаючыся ішоў ад падводы да падводы, на якіх пішчалі ўкормленыя парсюкі і кудахталі куры, і, гледзячы яму ўслед, сусед гаварыў суседу: «Баркін, смалакур». І нават той, хто бачыў яго ўпершыню, адразу здагадваўся, што ён — смалакур, бо твар яго, здаецца, быў закураны дымам, а валасы, што віліся на галаве, былі чорныя і смалістыя, падобныя на калматы сыры дым. Смалакур любіў пагаварыць з людзьмі, і стаяў падоўгу ля падводы нават тады, калі не меўся нічога купіць, і ўсе разумелі — чалавеку хочацца пахадзіць, пашпурхацца ў гаманкім людскім натоўпе.

Жыццё Баркіна, як і работа, напэўна, цяклі б плаўна і спакойна, як плынь на роўным глыбокім рэчышчы ад павароту да павароту, каб раптам смалзавод не перавезлі з Ухвалы ў Дзянісавічы. І Баркін па вядомай прымаўцы — куды іголка, туды і нітка — з сям'ёй і хатняй гаспадаркай перабраўся на новае месца. А неўзабаве яго праводзілі на пенсію.

Завод ён перадаў у маладыя рукі, хадзіў па двары самотны і прыгорблены, глядзеў невідушчым позіркам на рэторту, на чырвоныя штабялі выкарчаваных пнёў, і каб хто спытаў, што ён гаварыў у той дзень новаму майстру, то нічога б і не прыпомніў, бо ў галаве білася адна думка: «Вось і ўсё, расстаемся...» А калі збіраўся адыходзіць, нечакана адвярнуўся ўбок дастаў з кішэні хусцінку, выцер вочы і, каб пра яго не падумалі што-небудзь няпэўнае, ён сказаў: «Вось няшчасце: у вока сурынка трапіла».

Пакуль на двары грувасціліся назапашаныя штабялі старых карчоў, пакуль імі загружалі коптарам рэторту, пакуль нішто не ламалася і не крышылася,—з год смалзавод гнаў сабе смалу, як быццам нічога і не здарылася, даваў план. А на другі год ён нібы адчуў, што трапіў у іншыя рукі, якія не толькі не песцілі, не лашчылі яго, але і гатовы былі, нібы таго каня, сцебануць пугай, падагнаць, каб шпарчэй рухаўся; і ён як усё роўна засердаваў, заўпарціўся—кожная загружаная рэторта давала з кожным разам усё менш і менш смалы, шкіпінару, падсмольнай вады. Майстар бегаў, злаваў, але заводзік быў няўмольны, нібы рашыў адпомсціць за няўвагу і абыякавасць. Майстар убачыў, што прагарыць тут, як Заблоцкі на мыле, і даў лататы з завода. Тады і прыйшоў сюды Яўген Хораў.

ПЕРАД гэтым Яўген Шімафеевіч быў намеснікам ляснічага лясніцтва «Дзянісавічы», ездзіў каля завода, гаварыў з майстрамі, якія прыходзілі ў лясніцтва, каб аформіць адпаведны дакумент на падрыў пнёў, слухаў іх скаргі, і з усяго гэтага зрабіў вывад, што прычына таго, што завод не выконвае план, тоіцца ў карчах. Падрыўнікі, як ім здавалася, абышлі ўсе навакольныя лясы і дзялянкі чатырох лясніцтваў і нідзе не наткнуліся на пні, якім было б калі не ўсе пятнаццаць, то хоць бы сем-восем гадоў. А кожнаму, хто хоць кольвечы кеміць у смалакурнай справе, вядома, што чым больш год прастаіць пень у дзялянцы, тым больш смалы дасць ён. Стары, як пра яго кажуць, «пажылы» пень падобны на тоўстую кадушачку, налітую янтарнай смалой і закапаную напалову ў зямлю. Смала варыцца ў пні, адстойваецца ў сэрцавіне гадамі, і варта абсячы абалонь, палажыць на сонца, як, здаецца, смала сама закапае, пацячэ на дол.

Пень, якому не больш чатырох-пяці год, — зусім ужо не тое. З яго хаця і многа вугалю, але затое менш смалы. Такімі пнямі майстры і загружалі рэторту апошнія гады.

Неяк, капаючыся ў старых паперах, Хораў наткнуўся на схему, на якой былі абазначаны дзялянкі, лічы, што дзесяцігадовай даўнасці. Мяркуючы па плану, дзялянкі знаходзіліся далёка ад дарог, да іх маглі і не дабрацца падрыўнікі. Каб упэўніцца, што пні ніхто не кратаў, ён сеў на матацыкл і памчаў дарогамі і сцежкамі, пакуль не вылецеў на шырокі прагал. Злез з матацыкла і спачатку не паверыў вачам: на ўсёй дзялянцы не раўнуючы як абабкі, стаялі тоўстыя прысадзістыя пні—цэлы неруш. Хораў абышоў дзялянку ўздоўж і ўпоперак, стукаў падэшвай ботаў па пнях—чырвоныя, набрынялыя смалой, яны гулі глуха і нема, як усё роўна медныя. Гэта быў пэлы скарб, які трэба было хутчэй даставаць, выцягваць з зямлі.

МЫ СЯДЗІМ у невялічкай драўлянай прыбудоўцы, якая прыляпілася да рэторты; тут ціха і прахалодна, нават не верыцца, што прама праз дзверы, лічы за пяць-шэсць ад нас крокаў, гудзе і шалее вогненным смерчам топка, што тэмпература пад кажухом рэторты дасягае 400 градусаў.

Тут жа, паклаўшы на калені рукі, жылістыя, як дубовыя карэнні, з шырокімі, не раўнуючы як хлебныя лапаты, далонямі, прымасціўся на ўслоне апаратчык Уладзімір Хвядосавіч Піліпчык. Сам ён нізкі і каржакаваты, нібы той смаляністы корч. Работа яго ідзе з году ў год, з месяца ў месяц па аднаму і таму ж графіку, да якога ён прывык, як і да пары сутак — дня і ночы: шэсць дзён ён завіхаецца каля топкі, кідае ў яе ненажэрную пашчу бярозавыя і сасновыя чурбакі, праз суткі разгружае астылую рэторту ад вугалю, каб тут жа загрузіць яе новай порцыяй карчоў. Калі ўпраўляцца каля топкі параўнаўча лёгка—падкінуў кругляку ды і сядзі сабе,—то разгрузка і загрузка рэторты патрабуе ад апаратчыка вынослівасці і фізічнай сілы, а яе, як заўважаю, Уладзіміру Піліпчыку не пазычаць.

Каб я лепш зразумеў, як заводзік пераганяе карчы на смалу, Яўгеній Хораў вядзе мяне з прыбудоўкі на двор, паказвае дзяжу, што па берагі закапана ў зямлю ледзь не пад самай рэтортай. Чорная, як вугаль, смала цячэ па прасмоленым латку ад рэторты, ручаём зліваецца ў дзяжу. Смала густая і вязкая, што, здаецца, усадзі ў яе палец, як яна схопіць, засмокча яго і не адпусціць. Смалу адсюль чэрпаюць вёдрамі і каўшамі, напаўняюць ёй бочкі.

Побач з рэтортай — высокая і надзвычай тоўстая дзяжа, якую, пабраўшыся за рукі, наўрад ці абняло б і паўтара дзесятка чалавек. Гэта — халадзільнік. Тут сухая пара, што ідзе ад рэторты, ахалоджваецца, становіцца шкіпінарам і падсмольнай вадой.

Хораў паказвае ўсё гэта мне, і я час ад часу адчуваю на сабе яго позірк—ну як, ці падабаецца? — быццам гэта не заводзік, а яго роднае дзіця, і яму не абыякава, палюблю яго я ці не.

ЛЯСКОЧУЦЬ па гузатым карэнні вузкай лясной дарогі калёсы, рыпіць сцярмятная збруя. Мы, падкінуўшы пад бок ахапак травы, ляжым у драбіне—едзем у дзялянку да падрыўнікоў.

Цёмны лес з двух бакоў ушчыльную абступае вузенькую сцяжынку. Нарэшце, дарога ідзе ўгору, лес расступаецца. Засвяціўся шырокі прагал, і мы выязджаем на дзялянку. Хораў распрагае каня — няхай пасвіцца, а самі ідзём туды, дзе павінны быць падрыўнікі. Па ўсёй дзялянцы буяе канюшына, лапушыцца папараць,шамаціць званочкамі трава-званец, а над імі з гудам лятаюць пчолы, восы і мацратраўцы-авадні.

З долу ўстае і ідзе нам насустрач падрыўнік Віктар Макарэвіч. Ён толькі што папалуднаваў з падсобнікам, і таму рухі ў яго трошкі ленаватыя.

Хораў і падрыўнікі садзяцца на пні і доўга вядуць гаворку пра карчы, узрыўныя зарады, бікфордавы шнуры і яшчэ пра тое, каб яны асцерагаліся, крый божа, не ламалі маладыя саджанцы, што шнуркамі стаялі па ўсёй дзялянцы: інакш лясніцтва возьмецца за падрыўнікоў і яго, майстра-смалагона. Віктар Макарэвіч махае галавой (нібы адганяе авадней) у знак таго, што ўсё гэта яму даўно вядома і што ён так і робіць. Потым ён ускідае галаву, усмешка праходзіць па твары, і ён кажа:

— Можа, хочаце паглядзець, як мы падрываем пні? Дык мы зараз. У нас усё падрыхтавана ўжо.

Ён усхопліваецца на ногі, за ім і напарнік. Рукі, спіна, ногі ў яго расслаблена напружаныя, паходка мяккая, здаецца, ён пройдзе каля цябе—і ты не пачуеш. Яны ідуць да зарадаў, а мы сочым за імі са сховішча. Леглі, каб, чаго добрага, не зачапіла якім-небудзь аскялёпкам. Нам відаць, як яны прысядаюць раз-пораз каля пнёў, чыркаюць запалкамі, а потым нам чуваць тупаценне ботаў: падрыўнікі бягуць да сховішча. Пень, пад якім падпалілі шнур раней за ўсіх, уздрыгвае, на нейкую долю секунды замірае, быццам раздумвае: вылазіць ці не вылазіць з наседжанага месца, нарэшце падскоквае ўгору, выцягваючы з долу доўгія карэнні і разварочваючы вакол сябе прэлую зямлю. Павісеўшы раскракаў у паветры, ён грымнуўся вобзем. Услед за ім—гах! гах!—як па камандзе, з зямлёй і пылам узлятаюць суседнія пні.

Адгрукалі выбухі, і над дзялянкай зноў затрашчалі конікі, заціўкалі сініцы, зазвінелі пчолы,—пайшоў гадзіннік жыцця, заведзены навечна. А падрыўнік і яго памочнік ходзяць ад пня да пня з сякерамі, абсякаюць карэнне, складаюць карчы ў штабялі.

СЁННЯ загрузка карчоў у рэторту. Перад гэтым яна астывала, але ўсё роўна ўнутры ў ёй горача і душна, як у лазні, хоць зараз бяры венік і лупцуйся.

Уладзімір Піліпчык і Аляксандр Белы загадзя сцягваюць з сябе сарочкі і майкі і ныраюць праз жэрла ў рэторту. Як і знадворку, круглая ў сярэдзіне рэторта заглушае ўсе гукі, якія далятаюць сюды. І тут адчуваеш сябе, як у дупле. Сцены дыхаюць гарачынёй—вось бы сюды вентылятар!—падэшвам таксама спякотна: чым не гарачы цэх?..

Апаратчыкам чутно глухое гупанне конскіх падкоў, рып гужоў, то возчыкі Антон Дудко і Марыя Макарэвіч падвозяць карчы ад штабялёў. Жарало закрывае цень, і услед за гэтым на под рэторты ляцяць ахапак роўна парэзаных і паколаных карчоў-смалякоў.

— Бог памажы, спорнасць панажы,—не то жартам, не то сур'ёзна, як заўсёды гаворыць Уладзімір Піліпчык, зграбае смалякі і шпурляе іх Аляксандру Беламу. Тот роўна складае іх каля сценкі рэторты. Рухі як у аднаго, так і ў другога завучаныя, дакладныя. Працуюць яны хутка, весела, часам перакідваюцца нязначнымі словамі, але больш моўчкі, бо гамонка можа збіць з роўна ўзятага рытму. А калі саб'ешся з рытму, тады працаваць значна цяжэй, гэта, усё роўна як каціць калёсы па глыбокіх выбоінах. Апаратчыкі стараюцца працаваць дыханне ў дыханне і, што ім удаецца гэта, відно і вазакам — смалякі ў імгненне вока знікаюць з пода рэторты. Напал работы ўзрастае, вазакі круцяць над коньмі пугай, угрунь гоняць іх да штабялёў, насыпаюць поўныя драбіны карчоў і—хутчэй да рэторты!

Вышэй узнімаецца сонца, лютуюць звадні, разгарачаныя коні сякуць па баках хвастамі, фыркаюць, вазакі застаюцца ў адных майках, а рытм работы нібы падганяе: хутчэй, хутчэй...

Хораў выбірае хвіліну—заглядвае праз жарало ў рэторту: складня ступенямі ідзе ўгору. На адной з такіх ступеней стаіць Белы і выкладвае вышэй карчы, якія падае яму знізу Піліпчык. У абодвух мокрыя спіны, рукі, твары. Па целе цякуць ручайкі поту, на твары блішчаць адны толькі зубы. Смалякі Белы выкладвае паўкругам, нібы замуроўвае імі гарачую сцяну рэторты, аддаляючыся ад яе. Здаецца, што гарачыні становіцца трошкі менш: яе забіраюць смалякі, бо паволі робяцца вільготнымі і блішчаць, як фасфарычныя.

Давёўшы шнурок смалякоў да верху, Белы пачынае класці новую ступеньку з самага поду і, ужо стоячы на ім, гоніць уверх чарговы шнурок. Рукі наліваюцца стомай, галава пачынае звінець цяжкім звонам,—гэта знак таго, што час ідзе да абеду. Сапраўды, знадворку гучыць удар па жалезе, і апаратчыкі, чорныя, як вугаль, вылазяць з рэторты.

Яны валяцца на мураву, ляжаць некалькі хвілін, шырока раскінуўшы рукі, і прахалода абдымае іх разгарачанае цела, як рачная плынь. Хораў выносіць з прыбудоўкі вядро з халоднай вадой, апаратчыкі мыюцца, паліваючы адзін аднаму з кварты. Пасля развязваюць торбачкі, хусцінкі, садзяцца паўкругам, хрумстаюць агуркі, дастаюць вэнджаныя каўбасы і сала. Потым гадзіну—другую, пакуль зверне сонца, ляжаць у цяньку, набіраюцца сілы.

...ДА ВЕЧАРА рэторта загружана смалякамі з коптарам. Усе заходзяць у прыбудоўку і хто-небудзь, развязаўшы торбу, дастане па

СУСТРЭЧА З ПАНЧАМ І ЯГО ГАСПАДАРОМ

Даўганосы гарбун у блазенскім каўпаку на фестывальным плакаце — не мёртвы сімвал. Панч да гэтага часу жыве. Праўда, раней было многа Панчаў. Усе яны бадяліся па Англіі, з аднаго гарадка ў другі. Цяпер застаўся адзін Панч, відаць, апошні. Як і ўсякая рэч, — а ён лялька, рэч, — Панч прыватная ўласнасць. Належыць ён пажылому чырванашчокаму джэнтльмену Персі Прэсу. Гаспадар мае яшчэ некалькі лялек, складаную шырмачку, абцягнутую чырвоным аксамітам, і сякі-такі рэквізіт для выступленняў. Не адзін дзесятак гадоў Персі Прэс раз'язджае па краіне і паказвае правінцыяльным дзецям сваю нескладаную праграму.

Фестывальнае выступленне Персі Прэса або, як яго чамусьці называе рэклама, прафесара Прэса — у памяшканні лялечнага тэатра на набярэжнай. Тэатрык, падобны на летні павільён, хаваецца ў густой зеляніне маленькага саду. Тэатр належыць другому лялечніку—Эрыку Брамелу, які паказвае ў ім спектаклі марыянетак. Маленькі шкляны вестыбюльчык, дзе размешчана акенца касы і некалькі фатаграфій, вядзе ў глядзельную залу. Яна вельмі малая—каля дзесяці радоў па шэсць крэслаў у радзе. Сцены залы размаляваны пейзажамі, якія мы прывыклі называць базарнымі: бэзавыя далёкія горы, зеленаватае мора, блакітнае неба, кіпарысы, белыя калянады і вазы з квітнеючымі ружамі. Мініяцюрныя ацяпляльныя батарэі пафарбаваны залатой фарбай. На сцэне адсунутая ўбок чырвоная шырма Панча і круглы на адной ножцы стол, пакрыты аксамітным абрусам з майхрамі. З-за куліс даносіцца запісаная на плёнку класічная музыка.

Нарэшце ўсе месцы заняты. Сімфонія абрываецца, і гучаць урачыстыя гукі гімна Вялікабрытаніі. Усе ўстаюць і пачціва выцягваюць рукі па швах. Калі гледачы садзяцца, на сцэне з'яўляецца старамодны пан з наклеенымі вусамі, ідэальным прабораам і нейкім ардэночкам на штрыфелі пінжака. Публіка смяецца, і мы разумеем, што гэта не старшыня сходу або дакладчык, а Персі Прэс. Пан вітаецца і з незвычайнай важнасцю пачынае рабіць усялякія нескладзяныя фокусы: у яго пальцах то з'яўляюцца, то знікаюць ігральныя карты, са складак заслоны ён дастае курыныя яйкі, хавае рэчы ў чорную кітайскую шкатулку, а потым раскрывае ўсе яе сцёнкі і паказвае, што яна пустая. Гледачы крычаць з месца, рагочуць. Як і кожны фокуснік, Персі Прэс заканчвае выступленне найбольш эфектным трукам: з маленькай вазачкі ён выцягвае традыцыйны букет папяровых кветак.

У другім аддзяленні вузенькая, выцягнутая ўгору шырма перабіраецца ў цэнтр сцэны. Заслона ўзнімаецца, і мы бачым маленькі белы заднік з няўмела намаляванымі домікамі. З-пад дамоў выскоквае Панч — невялікая лялька з гарбатым носам, расцягнутымі ва ўсмешцы губамі і чорнымі зрэнкамі, якія зыркаюць у розныя бакі. Як і належыць, ён гаворыць паспешліва і пісклява. Гэты голас традыцыйны пры ігры Панчам. Пятрушкам і французскім Палішынелем. Дасягаецца ён пры дапамозе спецыяльнага прыстасавання — металічнага пішчыка, які кладуць у рот і прыціскаюць да нёба.

Панч то выскокваў знізу, то зноў правальваўся пад шырму, лаяўся з іншымі лялькамі і біў іх палкай. Усё, як на кірмашовых спектаклях сто, дзвесце, а можа і трыста гадоў назад.

Публіка апладзіруе, апладзіруем і мы старому акцёру-самавуку Персі Прэсу за тое, што, як мог, захаваў гэтае дзівоснае стварэнне народнай фантазіі — насатую ляльку, якая ўмее пастаяць за сябе.

АНГЛІЙСКІЯ КАЛЕГІ ПАНЧА

Пасля Прэса паказвае свае нумары Бары Сміт. Яго прадстаўленне ідзе ў тэатры прынца Уэльскага.

Зала тэатра невялікая — месц 400—450. Старыя пацёртыя крэслы, да спінак сядзенняў прымацаваны попельніцы. Курыць можна не толькі ў перапынках, але і ў час дзеяння. Партал сцэны афарбаваны чорным, адзенне сцэны — таксама чорнае. Пражэктараў мала, яны крыху большыя за нашы «пісталеты», але святла даюць значна больш. Калі яны загараюцца, на сцэну выходзяць двое мужчын гадоў па трыццаць пяць, хударлявыя, аднолькава апранутыя — чорны тонкі світэр, шэрыя вузкія штаны. Вітаюцца. Адзін з іх—Гары Сміт—гаворыць некалькі фраз. Партнёр кідае яму кавалак тканіны, Сміт абкручвае ім руку. Атрымліваецца сабака. Яна брыча, спрабуе саскочыць на падлогу, але заўважае гледачоў і палахліва прыціскаецца да грудзей акцёра. Так Бары Сміт ілюструе свой творчы прынцып, сфармуляваны ў фестывальным буклеце: «Лялька ёсць лялька, а не імітацыя жывога чалавека, і таму можа быць зроблена з чаго хочаш».

Пад нягучную музыку адзін за адным ідуць нумары праграмы. Вельмі розныя, непадобныя адзін на адзін. З'яўляецца, напрыклад, садовая лейка. Яна спачатку палівае ўяўныя кветкі, а потым пераварочваецца, і гэта ўжо не лейка, а вялікая галава. Носік лейкі становіцца носам, аправа акуляраў — вачыма, пучок травы — валасамі. Галава пераварочваецца, і гэта зноў лейка. Адзін з лепшых нумароў Сміта — байка пра ката і мыш. Кот вялізазны, абадраны, але важны. А мышка — маленькая, акуратненькая, мітуслівая. Мышка ў захапленні ад ката — ён такі паважны, мажны. Мышка радасна бегае вакол яго, не ведае, як дагадзіць. У парыве шчырасці яна прымаецца вязаць кату світэр. Вяжа хутка-хутка ,і трасучыся ад шчасця, тоненькім галаском нешта напявае. А паласаты світэр усё даўжэ, даўжэ...

У антракт збоку ад сцяны з'яўляецца накрыты белым абрусам стол, за якім дзве буфетчыцы наліваюць чай і прадаюць пячэнне. Гледачы падыходзяць да століка, плацяць шэсць пенсаў і з чашкай і сподачкам у руках вяртаюцца на свае месцы. Там п'юць чай і кураць. К канцу антракта стол знікае.

...Прадстаўленне лепшага ў Англіі марыянетачніка Эрыка Брамела вяртае нас зноў у наіўна размаляваную залу лялечнага тэатра на набярэжнай. Эрык Брамел — гаспадар гэтага тэатрыка. Ён сам ставіць і сам іграе ўсе адказныя ролі — добра, што яны амаль заўсёды пантамімічныя. Калі на сцэне некалькі персанажаў, яму нехта дапамагае. Хто гэты чалавек — нікога не цікавіць, публіка ведае аднаго Брамела.

Першае аддзяленне — нешта накшталт танцавальнай сюіты, дзе алегарычна паказваецца змена пораў года: зіма, вясна, лета, восень і зноў зіма. На сцэне пабудавана яшчэ адна сцэна — зусім мініяцюрная. Яна заліта фіялетава-зялёным святлом, на заднічку абрысы англійскіх домікаў. Убягае лялька, якая нагадвае Мефістофеля, і застывае ў эфектыўнай балетнай позе. Гучыць сімфанічная музыка, лялька скача, робіць нейкія пасы. Зверху на нітачках апускаюцца маленькія парашуцікі са шматкоў тканіны. Гэта снежынкі. Яны танцуюць — плаўна ўзлятаюць угору і зноў апускаюцца на падлогу. Потым таксама зверху на нітачках апускаюцца бутафорскія ландышы і цюльпаны. Іх танец сімвалізуе пачатак вясны. Лета чамусьці паказваецца не пантамімай або танцам, а размоўна-парадыйнай сцэнкай са «Сну ў летнюю ноч». Потым зноў сімфанічная музыка, па сцэне матляюцца на нітачках асеннія лісточкі і ўлятае балетны Мефістофель.

Саладжава-аматарскае першае аддзяленне цалкам акупляецца другім, ад якога мы атрымалі сапраўднае задавальненне.

Другое аддзяленне — канцэртнае. Брамел вядзе яго на авансцэне, перад закрытай заслонай. Па чарзе ён выводзіць лялек і паказвае свае лепшыя нумары.

Вось у паўкрузе святла ля ног акцёра выгінаецца смуглявая Кармен. Ляльку разглядаць няма калі, натуралістычная яна ці стылізаваная — гэта ўсё роўна, трэба паспець угледзець яе рухі, атрымаць асалоду ад дасканаласці і выразнасці паваротаў, дзівоснай падатлівасці ўсяго цела, поўнага зліцця руху з музыкай. Танец вельмі імклівы, жывы. А акцёр, што стаіць у паўзмроку над лялькай, нерухомы. Злёгку апушчана галава, прывычна, амаль непрыкметна працуюць рукі — перабіраюць ніткі, нахіляюць то ў адзін, то ў другі бок вагу— драўляную палачку, да якой яны прывязаны.

Потым Брамел выводзіць на сцэну адразу дзвюх лялек — плюшавых медзведзянят, зусім такіх, якіх прадаюць у магазінах цацак. Гучыць запіс вясёлай дзіцячай песенькі аб медзведзянятах, якія спрачаюцца: адно гаворыць, што трэба ісці туды, а другое — сюды. Спяваюць два звонкія дзявочыя галасы, вельмі меладычна і лёгка. Медзведзяняты танцуюць з дакладнасцю цацак, а паводзяць сябе як жывыя забаўныя малышы. Вось адно плюхаецца на падлогу, а другое стаіць над ім і ў такт музыцы дакорліва ківае галавой.

З такой жа лёгкасцю і гумарам іграе Брамел наступны нумар, які называецца «Хлопчык, што прытвараецца старым». Свавольны малыш уразвалку пахаджае па сцэне, абыходзіць вакол акцёра, садзіцца яму на чаравік, потым нават кладзецца на гэты чаравік, і раптам уцякае за кулісы.

Вельмі арыгінальны нумар, якім таленавіты англійскі лялечнік заканчвае праграму. Называецца ён, здаецца, так: «Колькі часу трэба ляльцы, каб навучыць танцаваць другую ляльку». Брамел выводзіць на сцэну зноў дзвюх лялек, адну вялікую, другую зусім маленькую, у касцюмах арлекіна. Большая трымае ў руках вагу з ніткамі ад першай. Спачатку рухаецца толькі большая, а меншая — нерухомая. Потым наадварот — маленькая лялька танцуе, а вялікая стаіць на месцы, пагойдваючы ў руках вагу.

Мы з задавальненнем апладзіруем акцёру...

КРЫВАЖЭРНЫ ДЗЕД І ФАНЕРНАЕ СЭРЦА

Марыянеткі папулярныя не толькі ў Англіі. Многа цікавага паказалі лялечнікі з Польшчы, Канады.

У канадцаў — усялякія цыркавыя нумары і нейкая статычная, вельмі размоўная п'еса з жыцця дзікіх індзейцаў. Двое чырванаскурых сядзяць вярхом на высечаным з бервяна ідале і стукаюць па ім тапорыкамі, не звяртаючы ніякай увагі на тое, што ідал даўно гатовы — адпаліраваны і размаляваны. Трое акцёраў стаяць над лялькамі на невялікім памосце і на вачах у гледачоў маніпулююць ніткамі. Нецікава і сумна.

Бельгійцы разыгрываюць легенду пра дзеда Раланда. Лялькі ў іх вялікія, грубаватыя, з металічным і загнутым, як ручка парасоніка, кручком у галаве. За гэтыя ручкі іх трымаюць. Марыянеткамі такіх лялек можна назваць толькі таму, што яны маюць ногі і акцёры водзяць іх зверху. Дарэчы, «вадзіць» — таксама не зусім дакладнае слова. Гэтыя лялькі хадзіць не могуць, яны скачуць па сцэне, цяжка стукаючы нагамі аб падлогу.

Сюжэт п'есы такі: дзед Раланд выклікае д'ябла і просіць зрабіць яго зноў маладым. Д'ябал згаджаецца, таму што дзед абяцае за гэта знішчыць людзей. Барадаты дзед ператвараецца ў закаванага ў латы рыцара і адпраўляецца ваяваць. Рукі лялек не кіруюцца, і размахваць мячамі яны не могуць, таму бітва выглядае так: у розных канцах сцэны, нібы кумпякі па кручках, гойдаюцца лялькі воінаў. Яны збліжаюцца і пачынаюць з размаху біцца адна аб адну, «грудзі ў грудзі», пакуль «забіты» не падае з грукатам на падлогу разам са сваім кручком. Нарэшце, «перабіты» ўсе воіны. Кучай драўляных «трупаў» заканчваецца першая дзея. У другой дзеі трупаў яшчэ больш. Д'ябал ахоплены жахам — ён не чакаў такога спрыту ад Раланда — і зноў ператварае яго ў барадатага дзеда.

Магчыма, бельгійцы імкнуліся паказаць сваё сучаснае іранічнае стаўленне да легенды і наўмысна выбралі такіх лялек і такі «стыль ігры». Але ім не хапіла гумару і мастацкага густу.

Два калектывы з Федэратыўнай Рэспублікі Германіі прывезлі два вельмі непадобныя спектаклі.

«Шыльдбюргеры» — інсцэніроўка адной з папулярных кніг XVI стагоддзя. Гэта жартоўная гісторыя аб тым, як свавольнік Каспар (нямецкая разнавіднасць Панча) угаварыў каралеўскіх чыноўнікаў кінуць абрыдлую службу і вярнуцца ў свае ўтульныя домікі да любімых жоначак. Лялькі ў гэтым спектаклі пятрушачныя, іх многа, яны даволі ўдалыя. Спектакль пастаўлены прафесіянальным рэжысёрам, які дасціпна высмеяў папяровы бюракратызм, — горы спісанай паперы ажываюць, шамацяць, носяцца па сцэне і накрываюць беднага чыноўніка, — прыдумаў забаўныя інтэрмедыі, — чапурысты танец павешаных на плечыкі камзолаў, — надзяліў Каспара розумам і тонкай іроніяй, — якая добрая знаходка! Каспар утыкае ў чарніліцу кветку, і зусім бянтэжыць гэтым чыноўніка.

На жаль, асобныя знаходкі не ратуюць становішча — спектакль не пайшоў далей супрацьстаўлення добрай хатняй утульнасці бяздушнаму бюракратызму «службы».

Калектыў з Бохума, сталіцы заходнегерманскіх лялечнікаў, гарадка, дзе наладжваюцца лялечныя фестывалі і нават ёсць спецыяльныя ўстановы, якія называюцца «Інстытутам лялечнага мастацтва», прывёз праграму, якая складаецца з асобных нумароў і прэтэндуе на апошняе слова ў галіне фармальных пошукаў. Пад магнітафонную музыку (даволі сур'ёзную) з-пад шырмы з'яўляюцца кавалкі фанеры рознай формы і колеру. Яны нагадваюць то каменні, то ветразі яхт, то чалавечыя галовы. Фанеркі плаваюць у паветры (і відаць палкі пад імі), збліжаюцца і разыходзяцца ў бакі. Нумары падобны на рэбусы, загадкі. Вось узніклі два плоскія кавалкі фанеры, у якіх можна ўгадаць сілуэты людзей у фас. Яны рухаюцца, мяняюцца месцамі. На адным сілуэце з'яўляецца чырвонае сэрца. Раптам яно аддзяляецца і аказваецца таксама фанеркай на палачцы. Павольна плыве фанернае сэрца да другога сілуэта і злучаецца з ім. Аб чым гэта? Аб каханні або аб аперацыі па перасадцы сэрца?

Выступленне бохумцаў было сустрэта вельмі стрымана. Яно выветрылася з памяці адразу ж, пакуль мы ішлі ад цэркваўкі, дзе яно адбылося, да гасцініцы.

ЗОЛУШКА ТАНЦУЕ «БУЛЬБУ»

Злучаныя Штаты былі прадстаўлены на фестывалі двума тэатрамі. Першага мы не бачылі, а другі даволі цікавы і вельмі тыповы для краін капіталізму. У гэтым тэатры толькі адзін чалавек. Ён і акцёр, і пастаноўшчык, і мастак, і рабочы сцэны, і электрык, і радыст, і шафёр. Яго завуць Дзік Майер. Да гэтага ён быў лётчыкам, інжынерам, фатографам, артыстам драмы. У яго няма вялікага стажу работы з лялькамі, як у людзей, што выступалі да яго. Ён амаль аматар. Але ў яго спектаклях — яны складаюцца з дзвюх невялікіх п'есак для дзяцей — усё прафесіянальна. Ніякай архаікі, натуралістычнай бясформнасці, аматаршчыны. Выразныя прафесіянальныя лялькі, добра арганізаванае дзеянне, дакладнасць ва ўсім — ад рухаў персанажаў да перамены дэкарацый. Дзік Майер глядзіць на п'есу і лялечнае мастацтва не чужымі, а сваімі вачыма. Яго забаўляе дзіцячая наіўнасць лялек, наўмысны прымітыў казкі. Таму лялькі ў Дзіка Майера, як карапузы: з круглымі галовамі, вялікімі наіўнымі вачыма, якія абведзены чорным контурам, дакладныя па сілуэту—фігура разам з касцюмам вылеплена з папі-машэ і пафарбавана. Ва ўсіх лялек ножкі, а водзіць іх акцёр спецыяльным дзержакам. Лялькі іграюць і гавораць так, быццам Майер у душы крыху пасмейваецца з іх. Гэты іранічны прымітыў лялек і выканання яшчэ больш узмацняецца кантрастам музыкі — сур'ёзнай, поўнай глыбокіх роздумаў. Іронія становіцца сумнай.

Першы спектакль —пра хлопчыка, які трапляе ў чужы горад, пра яго сустрэчы са злымі і добрымі людзьмі. Другі — перапрацоўка казкі пра Золушку.

У «Золушцы» няма ніякага балетна-арыстакратычнага налёту. Мачаха падобна на худую кухарку, а дачка — у спектаклі толькі адна дачка — тоўстая і дурная. Калі яны бягуць па лесвіцы ўніз — прыступкі аглушальна трашчаць ад іх тупату і выклікаюць выбух смеху ў зале. Дурная дачка, як і сама Золушка, ніякі не пераспелак, а капрызная дзяўчынка таго ж дзетсадаўскага ўзросту, як і малышы, якім гэты спектакль адрасаваны. Фея прыходзіць у хустачцы ў буйную гарошыну, за спіной у яе крылцы. Нават каралеўскі баль пазбаўлены свецкасці і вытанчанасці. Прынц і Золушка танцуюць не менуэт або меланхалічны вальс, а какетліва скачуць пад гукі нашай бадзёрай «Бульбы».

Такое вольнае абыходжанне з класічнай казкай можа выклікаць пярэчанні, але спектакль быў свежы і ў многім таленавіты. Пасля спектакля на сцэну выйшаў сам Дзік Майер — сарамлівы сутулаваты чалавек — і прапанаваў пагаваць, як ён працуе. Тканіна, якой быў абцягнены драўляны каркас шырмы, упала, і мы ўбачылі цесную прастору, разлічаную толькі на аднаго чалавека. Направа і налева віселі лялькі, ззаду стаялі фанерныя дэкарацыі, абодва пярэднія куткі заняты невялікім магнітафонам і пультам для пераключэння святла. Майер нагнуўся, уключыў магнітафон, узяў Золушку. Ляльку зрабіла некалькі крокаў і застыла на градцы, дзе спецыяльныя прыстасаванні дазвалялі зацісну дзяржак і пакінуць яе стаяць на сцэне. Акцёр вывеў Прынца, падвёў яго да Золушкі і таксама замацаваў на градцы. Калі Золушка гаварыла, Майер рухаў Золушку, а калі гаварыў Прынц — варушыў другую ляльку. Потым Майер павярнуў галовы абедзвюх лялек направа і вывеў з-за кулісы Міністра. Цяпер лялькі гаварылі ўжо ўтрох. Увесь тэкст п'есы быў запісаны на плёнку, таму лялек на сцэне магло быць яшчэ больш. Тэатр Дзіна Майера можна назваць лялечным тэатрам аднаго акцёра. Нам спадабалася вынаходлівасць, свежасць пачуццяў і адсутнасць дрэннага рамесніцтва ў гэтага разнабакова адоранага чалавека.

(Заканчэнне ў наступным нумары.)

Праняг. Пачатак у № 49.

POLSKA AGENCJA INTERPRESS для ЛіМа

Б'ЕНАЛЕ ПЛАКАТА Варшава, 1968

Нават беглае знаёмства са спісам удзельнікаў Другога міжнароднага б'енале плаката ў Варшаве дае ўяўленне пра размах гэтай творчай сустрэчы. У сталіцы Народнай Польшчы паказалі свае работы мастакі Англіі, Аргенціны, Аўстраліі, Аўстрыі, Бельгіі, Балгарыі, Бразіліі, Венгрыі, Венесуэлы, В'етнама, ГДР, Галандыі, Даніі, Іспаніі, Італіі, Канады, Люксембурга, Манголіі, Нарвегіі, Перу, Польшчы, Румыніі, ЗША, СССР, Турцыі, ФРГ, Фінляндыі, Францыі, Чэхаславакіі, Швейцарыі, Швецыі, Югаславіі, Японіі.

346 мастакоў з 33 краін — 651 плакат. Гаспадары б'енале — польскія плакатысты — паказалі 92 работы 47 майстроў.

Ідэя арганізацыі Міжнароднага б'енале плаката была падтрымана ва ўсім свеце. Выстаўка стала месцам параўнання творчых дасягненняў, паказала ролю, якую ў наш час у жыцці народаў і краін адыгрывае плакат. Яго часта называюць мастацтвам вуліцы.

Ужо на папярэднім б'енале мы былі сведкамі досыць знамянальнай з'явы: плакатнае мастацтва, надзвычай дынамічнае ў развіцці, з кожным годам мяняе не толькі арсенал фармальных выяўленчых сродкаў у адпаведнасці з пануючымі ў пэўны момант у мастацтве кірункамі і плынямі, але і тэматыку, усё часцей закранаючы вялікія і складаныя праблемы, якія цікавяць усіх нас.

Другое б'енале яшчэ раз паказала, што гледачы, цалкам ацэньваючы здзіўляючае багацце форм і выяўленчых сродкаў, надзвычайную тэхнічную дасканаласць, падоўгу затрымліваюцца менавіта, ля тых работ, аўтары якіх звяртаюцца да надзённых праблем сучаснасці.

На Другім міжнародным б'енале плаката сабраны работы, створаныя мастакамі розных краін у 1966—1968 гг.,— і мы даведаемся, якія праблемы хвалявалі іх у гэтыя гады, што прыцягвала іх увагу, чым у гэты час жылі іх краіны і народы. Ёсць на выстаўцы чыста рэкламныя плакаты, ёсць работы, прысвечаныя розным культурным падзеям, тэатральным спектаклям і кінафільмам, і ёсць плакаты, што ўздымаюць грамадскія тэмы. Плакаты, якія змагаюцца, выказваюць імкненне ўсіх людзей да міру на зямлі, адлюстроўваюць барацьбу народаў за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, напамінаюць пра пагрозу атамнай смерці, уваскрашаюць страшныя ўспаміны другой сусветнай вайны.

Міжнародная выстаўка плаката размясцілася ў залах варшаўскай галерэі «Захента». Яе ганаровы шэф — старшыня Савета Міністраў ПНР Юзэф Цыранкевіч. Адкрыў выстаўку 4 чэрвеня міністр культуры і мастацтва Люцыян Матыка. Наведвальнікі, польскія і замежныя, могуць аглядаць яе экспанаты да 20 жніўня г. г.

Адкрыццю б'енале папярэднічала работа міжнароднага журы, якое ўзначальваў прафесар аддзялення графічнага мастацтва Такійскага універсітэта Такашы Кона; віцэ-старшыня журы — савецкі мастак-графік Арэст Вярэйскі; сярод членаў журы — відныя мастакі, у тым ліку вядомы амерыканскі графік Соўл Баас, італьянскі графік праф. Эўджэніо Кармі, прафесар графікі Каралеўскага інстытута мастацтва ў Амстэрдаме Вім Гендрык Кроўвел, мастацтвазнаўца, крытык і рэдактар швейцарскага часопіса «Нойе графік» Ганс Нейбург, прафесар варшаўскай Акадэміі выяўленчых мастацтваў Аляксандр Кобздай.

Журы прысудзіла дзевяць прэмій па трох тэматычных групах: грамадскі, культурны і рэкламны плакат. Тры залатыя медалі атрымалі прадстаўнікі Польшчы, ЗША і Японіі. Узнагароды, між іншым, нікога не здзівілі, бо плакатнае мастацтва гэтых краін сусветна вядома. Сярод грамадскіх плакатаў залатым медалем адзначана работа «Асвенцім — Бжазінка» польскага мастака Юліяна Палкі, прафесара Варшаўскай акадэміі выяўленчых мастацтваў. Плакат, які надзвычай уражвае сваёй формай і не толькі ў палякаў выклікае ўспаміны аб трагічнай смерці мільёнаўахвяр фашызму. На грамадскую тэму створаны і работы, якія атрымалі сярэбраны і бронзавы медалі. Гэта плакаты фінскага графіка Кыосці Тапіо Варыса аб шкоднасці курэння і француза П'ера Бернарда «Грамадзянін».

У катэгорыі культурных плакатаў залаты медаль прысуджаны віднаму амерыканскаму графіку Андзі Вархолю, сярэбраны медаль—Іка Танака з Японіі, бронзавы—Гюнтэру Рамбову з ФРГ.

І, нарэшце, сярод рэкламных плакатаў залатога медалю ўдастоены работа «Экспо-70» японца Йусаку Камекура, сярэбранага — плакат «SD» японца Казумаса Нагаі, бронзавага — плакат «BIC» швейцарскага графіка Рэдзі Кюлінга.

Міжнародае журы прысудзіла пяць ганаровых дыпломаў плакатыстам СССР, Швейцарыі, Швецыі і Злучаных Штатаў (два).

Цікавасць да Міжнароднага б'енале плаката ў Польшчы настолькі вялікая, што многія ўстановы, арганізацыі і таварыствы вырашылі ўстанавіць, як і ў часе Першага б'енале, спецыяльныя грашовыя прэміі. Сёлета такіх прэмій чатырнаццаць. Міжнародны саюз графікаў (AGI) узнагародзіў маладога польскага мастака Марэка Фрэйдэнбрэйха. Прэмію Галоўнага праўлення Саюза польскіх мастакоў атрымаў выдатны польскі графік Генрык Тамашэўскі. Прысуджаны таксама прэміі Польскага камітэта ЮНЕСКА, польскіх бюро падарожжаў і інш.

З выпадку адкрыцця б'енале ў Польшчу прыехала з-за мяжы група вядомых мастакоў, вучоных і крытыкаў. Госці ўдзельнічалі ў адкрыцці Другога міжнароднага б'енале, прысутнічалі на ўрачыстым адкрыцці першага ў свеце Музея плаката.

Музей плаката знаходзіцца непадалёк ад Варшавы, у маляўнічай мясцовасці Вілянуў, на тэрыторыі былога каралеўскага маёнтка, які славіцца надзвычайным па прыгажосці Вілянуўскім палацам (пабудаваны каралём Янам III Сабескім), адным з каштоўнейшых гістарычных помнікаў Польшчы. Ад ваеннага пажару ўцалеў фасад старадаўняга манежа, пабудаванага ў сярэдзіне XIX стагоддзя па праекце італьянскага архітэктара Ф. М. Ланчы. Фасад рэстаўраваны, а сам манеж пераўтвораны ў сучасны ашклёны музейны павільён, з дахам арыгінальнай канструкцыі, з выхадам у сад і ва ўнутраны дворык, які з'яўляецца дадатковай выставачнай плошчай. У музеі ўжо ёсць 14 тысяч экспанатаў—работы польскіх і замежных плакатыстаў. Тут цудоўна абсталяваная рэстаўрацыйная майстэрня, запаснікі і г. д.

Да Другога б'енале плаката прыўрочана яшчэ адно мерапрыемства—навуковы сімпозіум. Сімпозіум, які адбыўся ў час Першага б'енале, даў даволі багаты матэрыял, пасяліўся сербы. Маленькі Сентэндрэ стаў венгерскім цэнтрам праваслаўнай царквы. Тутэйшыя сербскія цэрквы, царкоўны музей карыстаюцца еўрапейскай вядомасцю. Зараз тут запружваюцца два ручаі і на ўтвораным возеры размесцяць старажытныя вадзяныя млыны, лодкі і разнастайныя рыбалоўныя снасці.

У будаўніцтва музея пад адкрытым небам трэцім уключыўся Самбатхей, горад у Заходняй Венгрыі. Стваральнікі музея аб'ехалі 229 сёл у пошуках цікавых з пункту гледжання гісторыі народнага будаўніцтва пабудоў: дамоў, хлявоў, падвалаў, званіц, пасек і г. д. шчаным непадалёк ад Будапешта, на беразе Дуная. Сам Сентэндрэ, заснаваны яшчэ рымлянамі, поўны цікавага. Тры стагоддзі таму назад тут, ратуючыся ад грэчаскіх мараходаў і туркаў, пасяліліся сербы. Маленькі Сентэндрэ стаў венгерскім цэнтрам праваслаўнай царквы. Тутэйшыя сербскія цэрквы, царкоўны музей карыстаюцца еўрапейскай вядомасцю. Зараз тут запружваюцца два ручаі і на ўтвораным возеры размесцяць старажытныя вадзяныя млыны, лодкі і разнастайныя рыбалоўныя снасці.

У будаўніцтва музея пад адкрытым небам трэцім уключыўся Самбатхей, горад у Заходняй Венгрыі. Стваральнікі музея аб'ехалі 229 сёл у пошуках цікавых з пункту гледжання гісторыі народнага будаўніцтва пабудоў: дамоў, хлявоў, падвалаў, званіц, пасек і г. д.



КАПІТАН. Фотаэцюд Я. КАЗЮЛІ.

ЖАДАНЫЯ ГОСЦІ ХЛЕБАРОБАЎ

Агітбрыгада Івацэвіцкага раённага Дома культуры часта сустракаецца з працаўнікамі сяла.

Самадзейныя артысты выступілі з канцэртам перад удзельнікамі традыцыйнай сустрэчы ветэранаў партызанскай барацьбы.

Пабывала агітбрыгада ў калгасах «Іскра» і «40 год Кастрычніка». Асабліва спадабаліся хлебаробам песні ў выкананні Тамары Дзяцел, Святланы Пархомік, Лідзіі Стрэшка і Міколы Пархоміка.

Разам з агітбрыгадай у калгасы выязджаюць лектары раённага аддзялення таварыства «Веды».

М. САКОЛЬЧЫК,
супрацоўнік раённай газеты «Кастрычнік».

ДА ВЕДАМА МАСТАКОЎ, НАРОДНЫХ УМЕЛЬЦАЎ, КІРАЎНІКОЎ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ.

ТЭРМІН ПРАДСТАЎЛЕННЯ ЎЗОРАЎ СУВЕНІРАЎ ПА АБ'ЯЎЛЕНЬНЫМ МІНІСТЭРСТВАМ ГАНДЛЮ БССР КОНКУРСЕ КАНЧАЕЦЦА 1 ЖНІЎНЯ 1968 Г.

ЖУРЫ КОНКУРСУ ПРОСІЦЬ УСІХ, ХТО ЖАДАЕ ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У КОНКУРСЕ, ПРАДСТАВІЦЬ СВАЕ ЎЗОРЫ ДА ЎКАЗАНАГА ТЭРМІНУ ПА АДРАСУ: МІНСК, К. МАРКСА, 8, БЕЛАРУСКІ ФІЛІЯЛ УСЕСАЮЗНАГА ПАСТАЯННАГА ПАВІЛЬЁНА ЛЕПШЫХ ЎЗОРАЎ ТАВАРАЎ НАРОДНАГА ЎЖЫТКУ.

У НАШЫХ СЯБРОЎ

ТРЫ МУЗЕІ ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ

У Венгрыі ідзе будаўніцтва трох музеяў пад адкрытым небам. Адзін з іх, гёчэйскі, ужо набліжаецца да завяршэння і ў бліжэйшыя месяцы адкрыецца для публікі. Гёчэй—гэта назва задунайскай мясцовасці, дзе размешчана 90 сёл. Гэта мясцовасць вызначаецца своеасаблівым дыялектам, характарным нацыянальным адзеннем, арыгінальнасцю будынкаў і своеасаблівымі народнымі звычаямі.

Гёчэйскі музей увасобіць у сабе настрой усяго гэтага раёна, усе яго характэрныя рысы. Ён пакажа, якой была гёчэйская вёска ў канцы мінулага стагоддзя. Цікава адзначыць, што ў Гёчэі будавалі не рамеснікі, а так званыя народныя майстры. Цяслярыць, вязаць чаўны, рабіць саманы, класці печы яны вучыліся не ў рамеснікаў, прафесіі гэтыя перадаваліся ад бацькі да сына. Дамы музея абсталяваны сапраўднымі гёчэйскімі рэчамі побыту. Вакол дома разведзены агароды і кветнікі. Гёчэйскі музей пад адкрытым небам, першы ў Венгрыі, адкрываецца сёлета 20 жніўня.

Другі такі музей узводзіцца ў гарадку Сентэндрэ, размешчаным непадалёк ад Будапешта, на беразе Дуная. Сам Сентэндрэ, заснаваны яшчэ рымлянамі, поўны цікавага. Тры стагоддзі таму назад тут, ратуючыся ад грэчаскіх мараходаў і туркаў, пасяліліся сербы. Маленькі Сентэндрэ стаў венгерскім цэнтрам праваслаўнай царквы. Тутэйшыя сербскія цэрквы, царкоўны музей карыстаюцца еўрапейскай вядомасцю. Зараз тут запружваюцца два ручаі і на ўтвораным возеры размесцяць старажытныя вадзяныя млыны, лодкі і разнастайныя рыбалоўныя снасці.

У будаўніцтва музея пад адкрытым небам трэцім уключыўся Самбатхей, горад у Заходняй Венгрыі. Стваральнікі музея аб'ехалі 229 сёл у пошуках цікавых з пункту гледжання гісторыі народнага будаўніцтва пабудоў: дамоў, хлявоў, падвалаў, званіц, пасек і г. д.

ПА СЛЯДАХ МІНУЛАГА

РАТУЙЦЕ ЗУБРОЎ!

У сакавіку 1944 г. у Белавежскую пушчу з Ружанскіх лясоў прыйшла савецкая партызанская брыгада «За Радзіму». Мясцовыя партызанскія групы і атрады перайшлі пад камандаванне камандзіра брыгады. У атрадзе імя Б. Хмяльніцкага, які ўваходзіў тады ў яе склад, было больш як 100 чалавек. Ён меў чатыры кулямёты, 14 аўтаматаў, 89 вінтовак і сем пісталетаў.

У красавіку 1944 г. камандзір атрада атрымаў заданне правесці разведку ў раёне Ходышава, Сокула, Кабыліна і Альшанкі. Туды адправілася група партызан на чале з начальнікам штаба атрада В. Шаўчэнкам. Выканаўшы заданне, група вярнулася на базу атрада імя Г. Жукава, якая знаходзілася ў лесе непадалёк ад Бранска. Там іх чакаў сувязны камандзіра брыгады са спецыяльным загадам, які вельмі здзівіў партызан. Загад быў такі: «Неадкладна вярнуцца ў пушчу, сабраць разрозненыя сілы атрада і прыступіць да аховы зуброў».

Партызаны доўга круцілі галаву над тым, што б гэта магло значыць. Але гэта была не кодавая назва, а чарговае заданне. Проста кіраўніцтва брыгады атрымала інфармацыю, што акупанты рыхтуюцца да лову зуброў, каб вывезці іх углыб рэйха, а калі гэта не ўдасца, дык знішчыць іх.

Пасля вяртання ў пушчу Шаўчэнка сабраў партызан, пазнаёміў іх з заданнем. Трэба было ўстанавіць месца збору зуброў, ахоўваць іх, трымаць жывёл у цяжкадаступных для ворага раёнах пушчы.

Апошняе заданне было асабліва цяжкае з-за ўмоў пушчы і мер, што прынялі немцы. Уся пушча была падзелена акупантамі на квадраты, усюды былі пастаўлены пасты, дзе заселі добра ўзброеныя салдаты.

Атрад быў зноў падзелены на групы. Гітлераўцы спрабавалі разведаць сілы партызан, таму было вырашана стварыць уражанне, быццам у лесе дзейнічаюць моцныя партызанскія злучэнні, замініраваць дарогі і шляхі.

Вялікую дапамогу аказала партызанам мясцовае насельніцтва. У маі 1944 г. у атрад імя Б. Хмяльніцкага ўступіў Ян Ахрымюк, жыхар вёскі Старыны. Ён выдатна ведаў пушчу і зрабіў атраду неацэнныя паслугі.

Два месяцы працягвалася «служба пастухоў». Партызаны, нярэдка прабіраючыся па пояс у вадзе, здолелі вызначыць месца стаянак сваіх «падапечных» — 10 зуброў.

Аднойчы партызаны